Уладзімер Дудзіцкі

«ДАРУЙ, ШТО Я ПЛАЧУ...»

ЗАМЕСТ УСПАМІНАЎ

Ураньні мае сябры зь літаратурна-лінгвістычнага факультэту Вышэйшага Пэдагагічнага Інстытуту здавалі залікі па гісторыі народаў СССР. На сталох ляжалі тоўстыя кнігі гісторыяў і палітграматаў. Гаворка ішла пра «турму народаў» і шчасьлівую маладосьць у краіне сацыялізму... Перада мною ляжаў ліст знаёмае дзяўчыны з дробнымі, але густымі плямамі на асобных літарах. «Даруй, што я плачу, пішучы гэтыя словы... Гаспадаркі нашае няма, а бацькоў таксама не засьпела. Што зь імі сталася — ня ведаю. Кажуць, што...» Перапыніў мяне выкладчык і паклікаў да адказу.

— Зноў пішаце вершы і нічога ня чуеце! — заўважыў ён.

Я, да болю ўзрушаны няшчасьцем знаёмай, патрапіў адказаць на пытаньне, але не на «выдатна», а на «вельмі дрэнна» з чырвоным запытальнікам. «Не, таварыш Пэрэльман, ня толькі чую, але й бачу гэтыя сьлёзы... Вось яны, паглядзеце»...

Адказ пачуў я ў канцы лекцыі: «А вам, таварыш, усё ж трэба пазнаёміцца з «турмой народаў»...

* * *

Ноч, як і вечар, выдалася цёплай і прыгожай. Падаў мяккі, пушысты сьнег. Хацелася кудысьці ісьці, ісьці, куды вочы глядзяць, ісьці ў глыбіню й экзотыку лірычна-рамантычнае ночы. Цягнула да сяброў, да роднае маці. У суседзяў, за сьцяною майго студэнцкага пакою, ішла гучная бяседа: абходзілі нарадзіны сына.

Меўся пісаць ліст да знаёмай. Думкі абарвала радыё. Гаварылася пра дзень Чырвонае Арміі, пра гонар службы бацькаўшчыне... Я выняў вайсковую картку з прызыўнага пункту і яшчэ раз прачытаў: «До особого вызова». Мне прыгадаліся словы любімага беларускага паэты, і я чамусьці запісаў іх на тым шматку паперы:

Жыцьцё, суровасьць і закон,
з табой ніяк я не паладжу.
Душа ня хоча быць званком
твайго і рогату, і плачу.

Праз гадзіну пастукалі ў дзьверы. У пакой увайшло НКВД. Ордэр на арышт. «Вось і «особый вызов»... — мільганула думка.

Гэтак скончыўся 22-гі і пачаўся 23-ці дзень лютага 1933 году на 22-ім годзе мае маладосьці.

* * *

Дарэмна цягнула да сяброў. Мы сустрэліся ў сівых скляпеньнях муроў: нас зьвёў суровы лёс жыцьця, жыцьця, якое ішло «от Москвы до самых до окраин»...

Ураньні я ізноў убачыў ліст мае знаёмае і тыя самыя дробныя, але густыя плямы на асобных літарах. Тут я сапраўды пераканаўся ў праўдзівасьці Пэрэльмана, што «вельмі дрэнна», і перад вачыма паўстаў чырвоны запытальнік у новай турме народаў, якая праглынула і першы падрыхтаваны мною зборнік вершаў «Песьні і думы».

Дажджлівым вечарам у жаўталістую, рудую восень 1934 году «сацыялістычная індустрыя» імчала нас у далёкія пусткі Сібіру.

Пад грукат калёс, нібы ў адказ на іронію лёсу, склаліся ў радкі верша словы:

Я пазнаў і Эўропу, і Азію,
і Аўстралію вызнаць шчэ мусіў...
Пустка сэрца маё ўразіла,
не пазнаў што як сьлед Беларусі.

* * *

«Труд перевоспитывает человека» — такой шыльдай сустрэлі нас драцяныя загароды канцэнтрацыйнага лягеру на ўскраіне катаржанскага гораду Новасібірску. Седзячы на абтоку гэтага людзкога ганьбішча, я пазнаваў непазнанае і глыбей адчуваў мала адчутую Радзіму: красу палёў і шум бору, сівыя туманы і тугу матчыных песьняў, сінь вазёраў і асалоду любасьці да роднае зямлі. Было крыўдна і балюча, але

Каму паскардзішся, каму,
каму жывое скажаш слова?
Вазьму лепш плач я, перайму
вятроў і звон лістоў кляновых...

Гэты плач і звон, што, здавалася, даносіліся з Бацькаўшчыны, былі жывільнай стравай душы, крыніцаю будучае творчасьці ў новым часе, калі былі б у стане прачнуцца зьняволеныя «песьні і думы»...

* * *

Прайшлі, прамінулі гады. Зарубцаваліся раны, але ня сплямілася перажытае. Душа беларуса жывучая, ня ўмее маўчаць ні ў часіны радасьці, ні смутку. Яна сьпявае і вядзе напярэймы жаданьням, а жаданьнямі гэтымі ёсьць шчырасьць і праўда жыцьця, ці гэта на Бацькаўшчыне, ці, як суджана ізноў злым лёсам, — на чужыне.

Бэрлін, 9 верасьня 1944 г.

ТАЙНІЦЫ СЬЛЯПЯНСКАГА ЛЕСУ

За Менскам, на шостай вярсьце ад Парку культуры й адпачынку, у лесе Малой Сьляпянкі, пахаваны вялікія тайніцы жыцьця. Сьляды страшэннага злачынства пазарасталі даўно мохам і травою, але памяць часам ня сплямілася.

Я хачу расказаць пра тое, што бачыў на собскія вочы, і тое, што гаварылі мне жывыя сьведкі ды апавядальнікі чутага ад іншых. Ня ведаю, дзе цяпер гэтыя людзі. Бальшыня зь іх, напэўна, загінула ў канцэнтрацыйных лягерах Сібіру, а косьці іншых, магчыма, буцьвеюць у тым самым Сьляпянскім лесе... Пра гэтую праўду не напіша ніколі ні маскоўская «Праўда», ні менская «Зьвязда».

1932 год. Студэнты Менскага Пэдагагічнага Тэхнікуму імя Ўсевалада Ігнатоўскага адбывалі на Дасьледчай станцыі ў Малой Сьляпянцы сваю месячную сельскагаспадарчую практыку. Дырэктар станцыі папярэдзіў: «За дзьвесьце мэтраў ад баракаў пачынаецца ваенная зона, хадзіць туды забараняецца!»

Аднаго дня наказалі мне, што бацькоў выгналі з калгасу, а старэйшага брата пасадзілі ў турму. Хацелася йсьці на край сьвету. Надвечар я паклікаў блізкага сябра Сяргея Русаковіча, маладога беларускага пісьменьніка, і мы, нікому нічога ня кажучы, падаліся ў лес. «Стары Барыс, што корміць канадыйскіх карпаў у сажалках, кажнага досьвітку бачыць «чорнага ворана», а тая ў лесе камяніца, кажа ён, ня дом адпачынку, а нейкая катавальня...» — гаворыць Сяргей. «А Рачыцкая, дачка каміса-

ра, гаворыць, што там поўна хворых», — заўважыў я. Розныя ходзяць чуткі... Каля забалаці, улева ад чыгункі Менск—Масква, мы прачыталі напісанае чырвонымі літарамі: «Конскі могільнік. Небясьпечна!» Мноства засыпаных і незасыпаных ямаў. Кавалкі гліняных трубаў, кучы хваёвых слупоў і скруткі калючага дроту. «Гэта, — гаворыць сябра, — для адводу вачэй... Барыс ведае ўсё чыста, папытайся толькі ў яго...»

Лес гусьцеў і рабіўся цямнейшым перад заходам сонца. У подыху вільгаці пахла трупной гнілотай. І вельмі блізка... Пачалі шукаць. «Бачыш?» — з жахам зьвярнуўся я да Сяргея. Дагэтуль не даваў веры, што можа ледзянець цела й замірацъ сэрца. На плашчыні нейкіх трох гэктараў, паміж радамі пасаджаных у 1925 годзе хвоек, жаўцелі, размытыя пазаўчарашнім дажджом, маленькія курганкі й велікаватыя насыпы. Было іх нешта каля шасьцідзесяці на першым пляне, а далей — яшчэ... і яшчэ... Шмат якія былі заваленыя ламаччам.

Весткі з дому і пах магільнай, чалавечай гнілі адурманілі галаву. Я адарваў вокладку Марксавага «Капіталу» і напісаў: «Пад якімі ж курганамі буцьвянеюць косьці маіх братоў: Якава, Уладзімера, Андрэя і Вінцэся?» Вокладку насадзіў на сук галіны, што абдымалася з аброслым травою курганам. «Ты звар'яцеў, ці што?» — з трывогаю крыкнуў Сяргей Русаковіч. Мне таксама хацелася крычаць і клікаць людзей шукаць родных і блізкіх. Калі мы пакідалі месца вялікага бойнішча, гэткія словы вырваліся з маіх грудзей: «Пачакайце, бальшавіцкія далакопы...»

На скрыжаваньні лясных сьцежак убачылі мы некалькі мужчынаў з рыдлёўкамі ў руках, абкружаных чырвонагаловымі энкавэдыстымі з сабакамі. Нельга было ўцякаць: перад намі стаяў ужо чалавек з аўтаматам. У вобразе гэтага двухногага зьвера я пазнаў рабатварага Васіля, Гіцля Бессардэчнага, як празвалі яго людзі маіх родных Дудзічаў. «Нешта вельмі шмат коней здыхае ў вас...» — сказаў я, не вітаючыся. «Глядзі, разумнік, каб замест каня твая галава ня трапіла ў яму... Ідзі, каб і духу твайго не было тут... Пагаворым пазьней», — аўтарытэтна выказаў Гіцаль Бессардэчны.

Каля Дасьледчай станцыі сустрэлі нас сябры: Сяргей Астрэйка, аўтар ненадрукаванай выдатнай «Бэнгаліі», Сяргей Гайка, Касянкоў, брат Міхася Зарэцкага, і студэнт Адам, пляменьнік Адама Бабарэкі. Апошні, моцна ўсхваляваны, паведаміў: «Дзядзька Барыс і студэнт Ахрэмчык арыштаваныя. Дырэктар пытаўся пра вас...»

Ноч была непрыемнай і вельмі трывожнай. Усе драбніцы, як жывыя, стаялі перад маімі вачыма. Мне здаецца, што й цяпер яшчэ чую дзікі крык ратунку, які даносіўся тае начы да нашага слыху з-пад таямнічае жоўтае камяніцы Сьляпянскага лесу.

28 лютага 1933 году вокладка Марксавага «Капіталу» зь імёнамі маіх братоў ляжала на стале сьледчага ў мурох Менскага НКВД. Сухатварая Навіцкая, што часта наведвала рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь», а пазьней і Малую Сьляпянку, гаварыла магільным голасам: «Вось мы й спаткаліся... Спадзяюся, што спаткаешся і з братамі...»

Увесну 1935 году ў чырвоных мурох Марыінскае турмы ў Сібіры пазнаёміўся я зь Вячаславам Ануфрыевым, былым малодшым лейтэнантам Менскага НКВД. Аднавокі сухотнік часта паўтараў мне: «Моцна пакараў мяне Бог за сьляпянскія душы... Ляжыць там ня менш дзесяці тысячаў».

26 сьнежня 1955 г.

УСПАМІНЫ

Праўду кажучы...

Вось яно, гэтае простае, а найлепш было б, — зусім прасьцюткае, але шчырае, жытае й перажытае...

Скажаце, пра самога сябе? Не — пра беларусаў, а спаміж іх, пэўна ж, і пра сябе самога, і пра сяброў, і пра блізкіх, і пра далёкіх. І пра шашаляў-валасацікаў...

Праўду вам, чытачы, кажучы, дык і з рознымі чужымі, з добрымі й благімі, разумеецца, ды, пэўне ж, з самымі што ні на ёсьць чужакамі-чужынцамі — улёгцы не разьмінуся.

А ўсё гэта кажацца, як пра тое і ўсе беларусы вельмі ж ведаюць, каб жыцьцё намі ўбачылася. Ды згінота тым, хто нам ліха зычыў. Кожны па-свойму: адзін зь мёдам, а іншы з чамярыцаю...

Шашаль-валасацік...

Усе гады аднолькавымі здаюцца, калі зірнеш на іх не падумаўшы. Аднак жа бываюць яны й лепшымі, і горшымі, а спаміж іх ёсьць і зусім непрыемныя, і часам надта ж ужо прыкрыя. Гэтакае ж самае льга сказаць і пра месяцы. У мяне, папраўдзе

кажучы, дык месяцы пераблыталіся з гадамі. Студзень 1933 году быў вельмі ж непрыемны і найбольш неспакойны з усіх, што перад ім мінуліся. А пачыналася ўсё вось як. Арыштавалі старога, згорбленага вайною пад самаварнаю Тулаю «гнаяскура» Калошу (гэтак празвалі на Менскім заводзе «Бальшавік» гаспадара мае кватэры на пасёлку Камінтэрн, што пад бокам самага Менску), суседа маіх бацькоў Хведара і бацьку сябра Пятруся, што жыў аднаго часу ў тым самым доме, выгналі з хаты й завезьлі ў шматнацыянальны Котлас. Маці ж мая наказала людзьмі, што «забралі з млыну старэйшага Рыгора», і што ён — «як у воду кануў». У роднага дзядзькі Якуба адабралі дом у Менску й ніякае за тое пісулькі не далі. Пісарчук райваенкамату ў Менску паведаміў суха, не падымаючы вачэй:

— Подготовительные курсы в военно-инженерную академию заменяются прохождением переменного лагерного сбора...

Пісарчук яшчэ нешта хацеў сказаць, але я так моцна скрывіўся, што ў яго склалася ўражаньне, быццам бы я не зразумеў сказанага, і ён перапытаў:

— Понятно?

— Усё да крупялінкі, — адказаў я й моўчкі выйшаў.

І думаеце, што гэта ўжо і ўсё, і ўсе тыя непрыемныя закавулінкі? Ого, калі ж бы яно так дый было! Каля Пляцу Волі, напрыклад, сустрэў аднаго знаёмага, а ён мне й кажа:

— Чуў, як пачалі трэсьці ў Наркамземе? Мой найлепшы сябра, прызнаюся табе, сказаў гэтакае: «Тае начы аж пятнаццаць чалавек вывалаклі зь іхных канцылярыяў».

Я ж меў свой уласны клопат і мусіў сьпяшацца. І запраўды, усё яно так пераблыталася, што ня бачыў, дзе яно пачынаецца і дзе яно мусіць скончыцца. А да гэтага ж яшчэ й усялякія чуткі, зьнітаваныя прыемнасьцю й непрыемнасьцю. Усякае ж бывае. Нехта, напрыклад, некаму казаў нешта, а гэтае «нешта», падшытае ветрам, а можа, і найпраўдзівейшае, ды іншым «нейкім» падліцаванае ці й зусім пераліцаванае, пераказвалася яшчэ некаму, і чуткі, як тая вужака, паўзьлі й шырыліся... Адным словам, як аднаго разу падсумаваў быў той, пра якога мова пазьней пачнецца, — заўшыца зь безгалоўем шлюбавалася...

Усё гэта лезла жывасілам у галаву, чаплялася з думкамі, параліжавала іх, грызла душу, а сам, здавалася часам, уліпаў у нейкае глейкае месіва.

З моцных ашчопцяў згрызоты вылузвацца ня так лёгка, і я прыгадваў тады аднавокага дрывасека Сялівона і ягонае апавяданьне пра маленькага шашаля-валасаціка...

— Кажаце, што дзерава болю ня мае? Эгэ ж, мае, ды яшчэ які! Яно, беднае, яшчэ ў сілу не ўвабралася, а валасацік ужо пад коранем у яго ззамаладу сядзіць і пад кару точыцца. Пнецца дзераўца зь ценю выбрацца, а валасацік ужо зьверху сьвідруецца — да самага нутра белага. Можа б, я й калодаў тых не калоў, каб ня гэтыя шашалі ды іншыя караеды ў сярэдзіне іх сядзелі. Секану гэта аднаго, і сэрцу адразу лягчэй робіцца...

Думаючы пра маладыя дрэўцы ды іхных шашаляў, хацелася сказаць усяму таму «Камінтэрну» — усім чысьценька:

— Эх, каб нашым Сялівонам волю ды сякеры ў рукі, колькі б шашаляў-душаедаў перасеклі б яны тады!.. І мая ж бо душа, напэўна, грызьмя ня грызлася б?

Украдзены Маркс...

У тых днёх меўся было ехаць на нейкі час дадому, пад самую Пціч, разумеецца, каб з маці ды з братамі пабачыцца. Самі разумееце, не ставала нікому паветра тады ў Менску, у нашым — Беларускім Менску. Аднак, кажуць, што ніколі яно не выходзіць так, як бы гэта чалавеку хацелася. Гэтак і са мною сталася. Аднаго вечара, як толькі адчыніў я дзьверы, гаспадыня, жонка арыштаванага «гнаяскура» Калошы, зірнула мне ў вочы і, памаўчаўшы (відаць, ёй было вельмі цяжка на сэрцы), паволі сказала <...>

— Якога? Лістаносца, хочаш сказаць?

— Не, што вашую кніжку панёс. Ён, калі вы езьдзілі ў той лес, дзе карпы гадуюцца, да Шчупака прыходзіў. І мама ведае, але ня кажа, баіцца надта.

— А дзе ж гэты «Шчупак» плавае, што й начаваць не прыходзіў? — пацікавіўся я, абы нешта сказаць.

— Ня ведаю...

Меўся яшчэ нешта сказаць, але Калошыха была пагукала. Я выняў ліст і пачаў чытаць.

«Даруй, што я плачу, пішучы гэтыя словы... Бацькі ўжо нямашака, а маці ў такой гарачцы, што гаварыць не гаворыць нічога... У вашую хату прыяжджалі з раёну й забралі твае лісты. Забралі й мае...»

Я ня памятаю цяпер, колькі разоў браўся чытаць ліст перапалоханае да сьмерці дзяўчыны: можа, і дзесяць, а можа, і пят-

наццаць... А тры рэчы, пэўне ж, не забудуцца: падкрэсьленае тры разы слова «ўцякай», няроўныя ад сьлёз сінія плямкі на літарах ды тое, абыякавае, цяжкае й саркастычнае: «Куды ж?.. Лезьці на яшчэ большы ражон?..» Уцякаць не было куды, аднак, некуды сьпяшаўся. Хаваў забароненае, выстаўляў наперад Маркса, Энгельса, Леніна й Сталіна, і нейкія, цяпер ня помніцца, палітграматы... Думалася, што абароняць. Думаў адно, а сталася зусім іншае. Як даведаўся пазьней, выйшла якраз наадварот: тэарэтыкі й практыкі марксызму-ленінізму валяліся ў кутках, а на самым відовішчы ляжалі ўсе «нацдэмы», розныя ўхілістыя і выкапаная, ліха ведае адкуль, кніжка пра нейкі ангельскі шпіянаж... Іншы б сказаў гэтак: «Чалавек клясычна падрыхтаваўся да сустрэчы гасьцей — трапіў як пальцам у неба»...

Паспрабуй давесьці, што ў Бога цялят ня краў і што Богу душой ня вінен.

Чорныя скуранкі...

Ноч, як і заменены ёю вечар, была цёплай і, як кажуць, вельмі ж прыгожай. Пасьля невялікай адлігі падаў буйны пушысты сьнег, раўнюткі, бязь ветру й подыху, сыпаўся ён, быццам тыя цудадзейныя бялюткія пушынкі, што спадаюць на ружовыя далоні казачных анёлкаў, ці тыя зорачкі — залатыя пялёсткі, што ў вокамгненнасьць і ня больш, як адзін-аднюткі раз на вяку, у сьне, пры найвялікшай чысьціні й супакоі душы, можа ўявіць сабе непазнаная сіла чалавечае ўявы. Гледзячы здалёку на стрэхі будынкаў, на дрэвы й ліхтары, здавалася, што перад вачыма, губляючыся ў далечыні, раскашуюцца ў белым золаце пялёсткаў неабсяжныя квяцістыя вішнёвыя сады... Зіма нагадвала вясну, а ад тае вясны, што яшчэ трымалася ў памяці, не засталося й сьледу...

Хацелася йсьці, ісьці ў глыбіню й экзотыку гэтае лірычна-рамантычнае, ніколі ня бачанае і ня чутае ў Менску начы. Сьнег усё буйнеў і гусьцеў, і нікога ня відно было: усё бачанае перад гэтым страціла ня толькі формы, але й свой убогі зьмест... І толькі яно адно, неспадзяванае ў гэтую дваццаць трэцюю і апошнюю «майскую» ноч у лютым 1933 году, страшэннае «руки вверх!», разбурыла і рамантыку, і экзотыку, і прынесеную сьняжынкамі лірыку... «Вось табе й уцёкі...» — падумаў я сам сабе, горка ўсьміхнуўшыся. «Дагоняць і перагоняць...»

На кватэры ўбачыў я тры чырвоныя галавы і тры даўгія чорныя скуранкі. Першая галава, таўсьцейшая і касаватая, паказваючы рукавом скуранкі ў закуткі пакою, сурова запыталася:

— Это называется любовью к вождям и партии?

Я маўчаў, але, прызнацца, глядзеў на павыкіданых правадыроў і напісаны імі ж камуністычны блуд зь вялікім зьдзіўленьнем. Спачатку не сказаў нічога. Маўчаў, чакаў нечага яшчэ страшнейшага. І яно прыйшло. Можа, гэта й не было страшнейшым, можа, яно было й зусім нястрашным, але ж мне здавалася: убачыўшы тое, што толькі цяпер пабачыў сам, зваліцца на галовы сяброў...

— А это что? Контрреволюционная национальная гниль? — з прысьвістам заўважыла найдаўжэйшая скуранка, стукаючы худымі пальцамі па нейкай бляшанай на стале пушцы й пільна гледзячы мне ў самыя вочы.

«Эт, што міру, тое й бабінаму сыну, — падумаў я, — а бараніцца не пашкодзіць — варта, трэба».

— Гэта вы самі, — кажу, — зрабілі ўсё.

На гэта адказала ўжо першая з другога боку, самая блішчастая скуранка з шырокімі, як засланка, грудзьмі:

— Не спеши, — времени для рассказа будешь иметь достаточно!..

Каля самых дзьвярэй стаяла, перапалоханая да паўсьмерці, жонка «гнаяскура» Калошы. Яе не адпушчалі і не дапушчалі — гэта, каб яна ня выскачыла часам ды чаму-небудзь не пашкодзіла, ды каб не зрабіла чаго-небудзь... Белая нерухомая постаць няшчаснай Калошыхі выдалася мне, немаведама чаму, паточаным Сялівонавымі шашалямі-валасацікамі маленькім слупком, добра прысыпаным перад гэтым дзівосным мяккім сьнегам, які так моцна браў мяне ў свае абыймы й вёў з-пад электрычных камінтэрнаўскіх слупоў да цеперся ўжо памерлага ў Савецкім Саюзе ратунку чалавечае душы. І мне стала вельмі шкада гэтага жывога, паточанага шашалямі слупка-чалавека... Каб мог, падышоў бы блізенька дый сказаў бы нешта мякуткае, цёплае — такое, як тыя сьняжынкі-пушынкі, што засыпалі мае сьляды за сьценамі «Камінтэрну». Але самым блізкім і дарагім ёй словам было б, напэўна, вось гэтае:

— Пацярпі, ты ж яшчэ не зусім памерла, а ён прыйдзе, вернецца й пабачыцца з табою... І ты скажаш яму й пра сёньняшняе зладзейства... Пра выцягнутага з хаты «Маркса» і пра кражу маладое беларускае душы... Не забудзься, раскажы яму ўсё,

а ён, твой родны Калоша, сустрэнецца з дрывасекам Сялівонам...

Сказалася б і нешта большае, і яшчэ шчырэйшае, калі б ня гэтыя там тоўстыя скуранкі ды не падрэзаныя крылы...

«Амэрыканка»

У сярэдзіне «чорнага ворана» нікога не было. Сам — і голыя рукі. Біся ілбом у сьцены, маліся, а хочаш — прасі ратунку, ня будзе табе радачкі. Непрыемна і вельмі цяжка, аднак цешыла адно: і там я не адзін буду... У тым страшэнным згубішчы, куды імчаць мяне доўгія чорныя скуранкі, сустрэнуся — і гэта напэўна — зь сябрамі, з блізкімі, магчыма, з роднымі.

Сёньня, згадваючы пра жытае й перажытае, пачынаючы просты пераказ таго, што калісьці сталася ды што ніколі й нічым ня сплямілася, прыгадваю, як, пад'яжджаючы да зялезнай брамы катавальні, пачаў моцна сьмяяцца.

Няхай сабе яно гэтага вялікага ці, як кажуць людзі, горкага гора й не было яшчэ, але вырваны з гарачых грудзей халодны сьмех быў вельмі ж горкі, бо гора звычайнае, калі льга гэтак выславіцца, і далёка ад камяных мяшкоў савецкіх катавальняў цеперся ўжо ў раскошных санях ёмка сядзела... Як тыя халодныя мармуровыя пліты, спорна слаявалася яно пад сэрцам і грудзі расьціскала. І от, калі тое слаяваньне завяршылася й падступіла пад самае горла, на канцы двух адцінкаў часу — звычайнага гора няволі на «волі» і «волі», прымкнутае перад пачаткам вялікага гора ў сутарэньнях ГПУ, — у чорнай, маўклівай пусьціні «чорнага ворана» грудзі ня вытрымалі нутранога ціску — паддаліся: з горла выкаціўся сьмех, закалыхаўся й захлынуўся... Ягоны сьлед, відаць, не адразу споўз з пакрыўленых лёсам вуснаў, бо, вылазячы з «ворана», што стаяў, упёршыся задам у нейкую жоўтую пазуху муру, чырвоная галава чорнае скуранкі, што ўвесь час мясьцілася паміж двума дзьвярыма, прызналася ўголас:

— Имей в виду, арестованный: мы шутить не умеем!..

Можа б, і не адказаў, каб не раптоўны голас другое галавы збоку:

— Посидит — узнает...

— Ведаю... Расказвалі... — меў я неасьцярожнасьць, як казаў той, выказацца.

Найноўшая скуранка (праўдзівей — наймалодшая, бо яна ж была жывой) сказала коратка, упэўнена:

— Видно, видно... Не ошиблись...

Зялезныя дзьверы на рагу Савецкай і Ўрыцкага адчыніліся й зачыніліся... Зачыніліся не абы-як, а з мэталёвым звонам і грукатам — шчыльна й надоўга...

Далікатныя ў недалікатным месцы...

У каманданцкай было нешта каля сямі розных і вельмі адменных душаў: зусім маладыя, старэйшыя і стараватыя, ці, як кажуць прасьцей, ужо добра прытаптаныя жыцьцём, абдзёртыя й прыбраныя, не раўнуючы, як тыя кірмашовыя лялькі. Гарадзкія...

Вырозьніваліся ўсяго дзьве душы: прыземістая, у белым кажусе воўнаю наверх, у валёнках і авечай шапцы-вушанцы, нагадвала белага палярнага мядзьведзя, ды танклявая й гонкая, маладзейшая, у янотавым футры, у новых унтах (сібірацкія ласёвыя боты, поўсьцю наверх), з капелюшом і пукатымі акулярамі ў тоўстых абадкох з шырокімі завушнікамі й надта ж ужо вымілаванай бародкай, — нагадвала ні то нейкага заморскага навукоўца, ні то галоўнага савецкага інспэктара нейкага, скажам, «зьверпуштрэсту»... Адным словам, ні разу не даводзілася мне сустракацца з гэткімі «арыгіналамі» на менскіх брукаваных вуліцах. Глядзеў і дзівіўся, бо выдаліся мне яны чымсьці незразумелым, загадкавым і, апрача ўсяго, нечым далікатным у недалікатныя сацыялістычныя часы ды яшчэ ў тым надта ж ужо недалікатным месцы... Адразу набеглі на розум і старая Тэкля, жонка запраторанага немаведама дзе Калошы, і стары дрывасек Сялівон: гэта ж, бадай што, і ці ня ёсьць праўдзівыя скурагноі, ці шашалі-валасацікі, што ад таго кораня пад кару точацца або зьверху, праз патыліцу, да нутра белага сьвідруюцца? «Убачымся, калі суджана будзе», — падумаў я, і думкі абарваліся, зьніклі... Спалох і моцнае дагэтуль хваляваньне таксама мінуліся. Вытварыўся стан крытычнае абыякавасьці, і зусім не цікавіла мяне, ці застануся ў кутку каманданцкай, ці далей павязе «чорны воран», ці... Ніводнае і ніякае «ці» не турбавала больш мяне.

Трываў бы гэтакі стан цімала, каб не трагічнае «а-ай, а-ай, а-ай», што покатам кацілася аднекуль і, б'ючыся ў зьнітаваныя горам і бядою сьцены калідораў, рабілася яшчэ трагічнейшым.

Карчакаваты, чорны й калматы, як сібірскі мядзьведзь, вузкавокі камандант, пазіраючы ўпорыста ў масыўныя акуляры душы ў янотавым паліто, закрычаў:

— Убрать контрреволюцию!

На тварах «незразумелых далікатных арыгіналаў» мае вочы не спасьцераглі аніякага рэагаваньня, пострах. Павярнуліся моўчкі шырокімі сьпінамі да трох вартаўнікоў і схаваліся, напэўна, там, адкуль кацілася тое «а-ай, а-ай...»

Цішыню парушыла блішчастая скуранка, тая, што вартавала мяне:

— Товарищ комендант, арестованный пойман за «Коминтерном»... Изъятое налицо... Протокол обыска подписан на квартире...

«Сібірскі мядзьведзь» не сказаў ані слова вартавому. Штосьці пытаўся, штосьці запісваў і, нарэшце, загадаў падпісаць — не адзін раз, тройчы — нейкія паперы... Якія гэта былі паперы, ня помню і, відаць, ніколі не прыпомню.

У той мамэнт, калі нейкі маладзюк у вайсковай форме перадаваў вузкавокаму каманданту выцягнутыя з маіх чаравікаў матузкі й зьняты з вышыванае каласкамі й васількамі кашулі шырокі слуцкі пояс, прывялі Сяргея Астрэйку й Васіля Гінтаўта.

Сяброў пакінулі, а мяне павялі...

Вадзілі доўга. Ішлі калідорамі, выходзілі ў нейкія закавулкі. Па вузюткай і вельмі ж пакручастай, як той сьвярдзёлак, зялезнай драбіне лазілі і ўверх, і ўніз, і не адзін раз, а некалькі, шмат разоў... Спыняліся ў паўцёмных закутках, адкуль тхло цёплым густым смуродам... Ціснуліся сьпінамі да сьцяны, зноў падымаліся ўверх і, помніцца, — не памыляюся — варочаліся назад. Нарэшце ўвайшлі ў вельмі ж цёмны катух, а адтуль паволі, вобмацкам, ішлі наперад... Дзе былі — у будынку ці за будынкам — ня ведаю, не відно было, хоць пальцам вока выкалі, але пад нагамі чулася штосьці мяккае: ні то зямля, ні то нейкая мурава. Нейчыя моцныя рукі ўхапілі мяне ўпол, паднялі й пусьцілі. Рукамі намацаў нешта сьлізкае, цьвёрдае. Да слыху даносілася прыкрае цёпканьне нейчых ног. Жудасная цішыня скавала, скамяніла цела. Не адчуваў ні рук, ні ног. Чуў адноаднюткае — як варушыліся мае валасы. Толькі тады, калі йзноў загрукацела зялезная брама й залапатаў матор, дагадаўся, што

гэта зноў быў той самы «чорны воран». «Куды ж гэта яны? — вырвалася страхам з халодных грудзей нясьведамае пытаньне. — Ці не туды, адкуль ніхто й ніколі не варочаецца?»

«Воран» імчаўся нядоўга. Праз нейкі час зноў пранізаў мяне знаёмы грукат брамаў. Зноў заварушыліся валасы. Усярэдзіне, пад самым сэрцам, штосьці моцна ёкнула і гарачым варам разьлілося ў целе.

Перад вачыма, у цьмяным бляску ліхтароў, вырасла вялікая змрочная камяніца — вядомая менская турма...

Гулівэр Бязносы

Дзьверы ўпхнулі мяне ў камэру зь вялікімі натугамі й шчыльна паставілі перад мокраю касьцістаю сьпіною нейкага высачэзнага арыштанта. Гострыя, з лапцяватымі сінякамі, лапаткі незнаёмага мулялі твар. Салоны, сьмярдзючы пот зморшчанае патыліцы сьцякаў на вочы, на губы, плыў за каўнер. Чалавек не зьвяртаў ніякай увагі, наадварот, падаўся назад і моцна прыціснуў мяне да нечага вельмі цьвёрдага і яшчэ больш сьмярдзючага. Густая, вільготная гарачыня, быццам нейкае ліпкае месіва, усё больш і больш сьціскала галаву, налягала на плечы. Адольваючы млосны стан ужо зусім мокрага, вялага цела, я пачаў варушыцца і ўпірацца кулакамі ў калючыя косьці незнаёмага. Косьці крута павярнуліся, выхапілі з рук клунак і, недзе яго шпурнуўшы, заскрыпелі:

— Каб лягчэй было... Дахадзягаў паважаць навучыся!

Нада мною вісела жоўтая бязносая галава і, нешта гаворачы, моцна ціснула рукамі на плечы.

— Вучы, Гулівэр Бязносы, новую птушку, — пачуўся аднекуль непрыемны хрыплы голас.

Кінутае жартам, а можа, ліха яго там ведае, і ўсур'ёз сказанае языком гаваркога (у душу ж чалавеку, разумеецца, калі б і хацеў, ня ўлезеш) яшчэ больш падстрэнчыла Бязносага ды харобрасьці паддало помыслу ягонаму. Асунуўшыся ўніз, ашчаперыў, як той рак пад'едзеную сяляўку пры беразе, жылістымі рукамі маю паясьніцу, падняў і, прыгінаючы доўгім тулавам даўгавалосага маладзюка, паставіў на гладкі лапік мураванае падлогі — на самым відавоку арыштанцкай.

«Экспэрымэнт» быў гэтакім неспадзяваным і спрытным, што не знайшлося часу і падзівіцца яму. Ды, праўду кажучы, рап-

тоўнае перамесьціва не было ўжо надта й благім — прыемным нават. Якім быў, такім і застаўся, ні слова, ні паўслова майго не пачулі, што зубы скеліць меліся. Неацанёная ж розьніца вычулася адразу: ні сьмярдзючага табе пад носам баняка, ні тых мокрых лапатак з лапцяватымі сінякамі, дый самога паветра, няхай сабе й ня менш смуродлівага, — горка-кіслага, але нейкага радзейшага, болей было. Наагул жа, што ўсярэдзіне, то ня ззаду: адтуль, каб і паўмесяца стаяў, таўкучыся, дык зь людзьмі не запазнаўся б у сяродку дык і ты, як тая грыўня на далоні, відзён усім, і сам усё чысьценька бачыш.

Гулівэр Бязносы, аднак, зрабіў гэтую «апэрацыю» ня дзеля мае выгады (пазьней ён і сам прызнаўся, выскаляючыся), а дзеля сябе самога, каб пад тую забаўку й самому высунуцца хоць на тры тулавы наперад. От што найбольш карцела яму.

Я ж, нічога гэтага не разумеючы і думаць ня думаючы пра нейкую там благіню ўчынёнага, — «заўтра разгледжуся», думалася, зьняў паліто і пачаў было масьціцца на тым, з добрую шапку, лапіку, як раптам, быццам із самага дна кадушкі, загугнявілася:

— Чырвонцамі, прынц, месца вашывае купляецца...

Каля мяне стаяў, не раўнуючы, як той дубовы пень, малады жаўтавалосы чалавек. Калі я ўбачыў у ягонай руцэ свой пулярэс, мне зрабілася вельмі крыўдна, і я ня сьцерпеў (камень жа й той лопаецца), сказаў, гледзячы ў самыя вочы жаўтавалосаму дубоваму камлю, вельмі сьмела:

— Гэтага табе мала, зладзюга?

А ён, шэльма, і вокам не міргнуў, выставіў руку й кажа:

— А ну, паўсоценкі на буру з носа, прынц!

— І за навасельле пяцёрку, — захрыпеў Гулівэр Бязносы.

Успомніўшы, што ўсе грошы выграб з пулярэсу вузкавокі камандант і, унікаючы большых прыкрасьцяў, давялося йсьці на хітрыкі:

— Мне паўсотню, а твая рэшта, жаўцюга. Згода? І гэтаму разумніку не пашкадуй чырвонца. За гэтае ж «тваё» вашапруднае месца заплацім, спадзяюся, разам: і я, і ты. Твой Гулівэр, зірні на яго, заплаціў носам, і калі будзе такім разумнікам, заплаціць яшчэ чым-небудзь...

— Талкова, прынц, — выціснуў жаўтавалосы і паказаў Гулівэру пальцам на пагор, туды, адкуль ён выпхнуўся.

Чым бы яно скончылася, гэтае «хрышчэньне», ня ведаю. Першая сустрэча з «гаспадарамі» мокрага камянога мяшка нумар тры абарвалася звонам ключоў і — «с вещами»...

Пайшоў і Гулівэр, і жаўтавалосы дубовы камель, а зь імі — украдзены з кішэні пулярэс — бяз грошай.

І росы, і лотаць...

Сон згінаў галаву. Ногі не трымалі цела. Нічога й нікога ня бачачы, падуладны сіле ўласнае вагі, пасунуўся наніз, каб сесьці на скамечанае пад нагамі паліто. Цела не ўтрымала раўнавагі — пасьлізнуўся, апёрся рукамі на халодную цэмэнтовую падлогу і лёг на маленькім някупленым кавалачку турэмнае плошчы нумар тры...

Празь няшчыльна прыплюшчаныя павекі сачылася электрычнае сьвятло. Яно цямнела, шарэла, потым рабілася зырчэйшым, рассыпалася жывым срэбрам, варушылася, як жывое, а пазьней пачало ператварацца ў сіне-жоўтыя кругі, яны шырыліся, прыліпалі да твару й рабіліся мяккімі й цяплюткімі...

...Якая цудоўная раніца каля Пцічы! Сонца яшчэ няма, але вялізарнае сьветла-ружовае паўкола падымаецца ўсё вышэй і вышэй. Вось першыя праменьчыкі прыпалі да дробных, танюткіх карункаў вельмі сінюткіх хмурынак і доўга-доўга цалуюцца зь імі. На густым беразе аселіцы загарэліся росы...

І цудоўныя сінюткія матылькі...

Росы буйнеюць, буйнеюць, набліжаюцца да матылькоў, і ўсе разам коцяцца сустракаць сонца...

Я шпурляю шапку на рачны пясок, расшпіляю кашулю ды імчуся, разьвёўшы рукі, за росамі й матылькамі. Я лаўлю іх, я бяру іх рукамі, каб напіцца, каб умыцца. Росы робяцца драбнюткімі, рассыпаюцца й зьнікаюць. Замест сінюткіх матылькоў разгарнулася густая купчастая лотаць...

Вось і маці... Сьцелючы палотны, пытаецца:

— А чаго ж ты так рана выйшаў, сынку?

Бягу да рэчкі. Паплаўка шукаю — не відно. Цягну, а рыбіна хвастом за ваду чапляецца. От, ужо й над вадою паўтулава шчупаковага выгнулася, а хвост сіняваты яшчэ болей выгнуўся, і рыбіна-шчупак пад бераг круты, падрэзаўшыся, сіганула.

Стаю й росаў вачыма шукаю, а маці, несучы палотны мачыць, кажа:

— Позна, сынку, за хвост рыбка ня ловіцца...

Топяцца ногі ў пяску рачным, а я шапку шукаю. Маці палошча палотны ў Пцічы ды кажа мне, упікаючы:

— За дурной галавой, сынку, і нагам небалазе...

Сорамна мне, і лотаць тую таптаць пачынаю. А маці, выбіваючы пранікам палотны, вачэй ня зводзіць і кажа, галавой ківаючы:

— Ня шукай бяды, сыну, сама бяда знойдзе цябе. Бачыш, як Пціч наша пасінела?

А нехта ўголас мяне гукае...

Шмат людзей, і ўсе да лотаці бегчы хочуць...

— Нідзе не стае чалавеку месца таго: ні там, ні тут. Гіне чалавек ні за нюх табакі, а за пядзю камяную грызьціся будзе, а калі ўжо дзьве пядзі выгрызе, дык ужо й рыштант на галаву рыштанту садзіцца. І грызуцца людзі...

Сэнсу гэтае гутаркі не зразумеў адразу: таго, хто гаварыў, не відно было. Электрычнага сьвятла ўжо не было. Праз замерзлыя краты вакенцаў урывалася сьвежае марознае паветра. Ападаючы наніз, яно падымала кісьлю камянога мяшка й засланяла, быццам густым туманам, ягоных асельнікаў. Да мяне наблізіўся крываногі старэнькі й ціхутка-ціхутка прамовіў:

— Надта ж цяжка пакутавалі вы на гэтай вашывай лысіне...

Мікіта Бурболік

Якая вялікая няпраўда жыве на сьвеце! Няпраўда і ў маленькім, і ў вялікім. І самі празь сябе людзі бяз дай прычыны гінуць, і людзі празь людзей нізавошта гінуць. І наўчыцца язык за зубамі трымаць варта было б, і маўчаць нялёгка...

Шмат нядобрага й непраўдзівага. От, кажуць, «жывучы, як кот», «глухі, як пень», «цьвярды, як камень» ды шмат, шмат іншага. Адкуль гэта пайшло — немаведама. Тыя, што ўпоўніцу гора мелі ды корабамі яго мералі, сказалі б самаму лядашчаму, валачашчаму кату, найгнілейшаму трухляваму пню, найцьвярдзейшаму абросламу мохам каменю — усім разам і ўзапар: «Жывучы, як чалавек!», «Глухі, як чалавек!», «Цьвярды й нячулы, як чалавек!», «Глумлівы й зьдзеклівы, як чалавек!»

Мікіта Бурболік, стары ганчар з-пад Таўкачэвіч, той самы, што гаварыў пра мае пакуты ў сьне, зубамі б лапіка тае вашабойні ў камяным мяшку выгрыз бы, адваротнае пачуўшы, і ня

змоўчаў бы. Гэтак і было, прыгадваецца. Аднаго вечару, калі каўнер ягонае кашулі пачырванеў, як той бурак, пад ягонымі ногцямі, нейкі маладзюк-кішэньнік пакпіць адважыўся:

— Мікіта, як той кот жывучы, плюшчыць і плюшчыць жывёліну й жалю ня мае.

— А, коце, пацук галабокі, вашапруд карэлы! — усхапіўся стары Бурболік. — Усейныя б каты ашалелымі валяліся, каб выспыталі, чаго мы нахлябаліся. Стойма стаяць рыштанты-вашапруды, а ты — збоку і ня бачыш? Ці ж то людзі мы ў гэтым мяшку? То ж куль жывы, перавяслам камяным сьціснуты да вантробаў самых. Во які цярпючы ты, брыдота. А ты мне: «Мікіта, як той кот жывучы...»

Кішэньніка падтрымалі збоку, і ён не баяўся старога, аднак, відаць, не хацелася блазьнюку даймаць чалавека — схаваўся й ня пікнуў болей.

Апошняе гаварылася зласьліва, ціха й павольна, але вымаўлялася з асаблівым прыціскам. Відаць было, што чалавек меў немалую крыўду, нейкі закалец на некага. І от, калі гэты закалец падкалоўся няспрытна маладзюковаю сьпіцаю й забалеў, чалавек ня сьцерпеў, мусіў выгаварыцца, каб адлягло, каб на душы палягчэла. Адным словам, серабранскі разьнік, здаецца, найлепш ацанаваў Мікітава мастацтва: «Бурболік не гаворыць, а неяк выцягвае таго ката ды — цях яму па карку — цях, цях!» І калі б ня тое «мастацтва», дык Бурболікава дыскусія, напэўна, не ўзялася б і на ўвагу людзьмі — турэмшчыкамі, і сам Кішэньнік, што сьляпіцаю кожнаму ў вочы лез, не паквапіўся б на большае. А тут гэтае разьніковае «цях!», як і тое падбухторваньне збоку, гэта значыцца, іншымі кішэньнікамі, тузянула зноў маладзюка за даўгі язык, а Бурболік ня вытрымаў, і пайшла стралянiна...

— Крывалапікі!.. Агра няшчасная!.. — зазьвінеў Кішэньнік.

— Галота жаўтабрухая!.. — крыкнуў Мікіта й роўнай нагою затупаў.

— Пухляціна!.. Дахадзяга!.. — кіпеў Кішэньнік.

— Жабурыньне жабяе... Курашчуп сьмярдзючы, — наступаў Бурболік.

— Жарабятнік!.. Храпа булённая... — круціў клеймаванымі рукамі сіні Кішэньнік з-пад Ржэўску.

Лопнула, здалося, камяное перавясла, і Бурболікаў «куль жывы» заварушыўся, зашумеў і пачаў раскідацца.

— Націскай, пралетарыят!.. — падтыкалі кішэньнікі маладзюка з-пад Ржэўску.

— Цісні галадранца, Мікіта, — намаўлялі старэйшыя Бурболіка.

— Кулацкая правакацыя! — выціснуў злосна найвышэйшы кішэньнік, памагаты Гулівэра Бязносага.

— У лысіну сацыялізму, Бурболік!..

«Жывы куль» зарагатаў, загуў, затупаў нагамі, потым упхнуў у сярэдзіну «правакатараў» клясавага бунту, і камяное перавясла зноў сьціснулася.

У турме, не раўнуючы, як у тых хмарках: і маланка, і гром, і сонца. Сталага нічога нямашака, усё неспадзяванае: неспадзявана прыходзіць і неспадзявана ўціхамірваецца. Часам пакрыўдзіць каго-небудзь, а іншага пацешыць, а бывае — і зусім наадварот: прыцісьне й расплюшчыць...

Добры быў чалавек Мікіта Бурболік — чалавек трыццатых гадоў... Тхло ад яго смуродам арыштанцкіх і пахла беларускай зямлёй. Апошняе было гэтакім моцным, што часам думалася: вось ён, гэты сапраўдны беларус. Першае, што йшло ад арыштанцкіх, — набытае ў няшчасьці, уклінене чужою сілаю, другое ж, што йшло ад зямлі, — ураджонае, высмактанае з матчыным малаком і добра ўкаранелае.

Гадамі «вялікага пералому» расхістаўся Бурболікаў грунт, надламаліся ягоныя карані, а крыклівы, неданошаны чырвоны плод сацыялізму вырваў гэтыя карані, паадсякаў іх, атрос зямлю і шпурнуў таўкачэвіцкага селяніна-ганчара ў брудныя, сьмярдзючыя гарадзкія клапоўні, так, як сам Бурболік шпурляў, бывала, чарап'ё нядобра выкручанага гарлача.

От і перакідаюць яго зь месца на месца — з клапоўні ў клапоўню, перакочваюць з боку на бок, сушаць ягонае гаспадарскае сэрца. Пашчапалася суцэльнасьць, а чарап'ё бразгаціць і ня клеіцца. І дзеці галадаюць, плачуць, і жонка пакутуе пад старым зрубам, чакае. Чатыры гады чакаюць галодныя раты кармільца.

І цяпер стаіць гэты шчуплы, крывенькі Мікіта перад маімі вачыма. Стаіць і жмурыцца. Пазірае з кутку на белыя ад марозу краты камянога мяшка нумар тры, на парэзаныя кратамі маленькія сіненькія кавалачкі неба, чухаецца й расказвае хвораму Бараўцу чыстую праўду:

— Пад Варонежам выцяла мяне жалязякаю. І поўзаць ня поўзаў, здаровеняк, каб ты ведаў, качаўся й енчыў гэтак. І гаіць не гаілі ран. А чмыр нейкі прыйшоў дый кажа: «На хронце абы рукі й вочы меў, а па назе клопат невялікі, абыдзешся...» І пагналі гэтак, каб ты ведаў, здаровеняк. Бачыш, і нашу крывулю — ня ломіцца, а скрыпіць, трасца ёй у бок, трудзіць качарэжка...

Бурболік выцірае кулаком сьлёзы, каб Баравец ня ўбачыў іх, і далей суча вузлаватую нітку ўспамінаў:

— Цяжка крывому на сьвеце жыць. Прузына й Лявонка паўвалоку ўрабляць памагалі. І хлеба, і да хлеба мелі, і гарлачы мае на глум ня йшлі, капейку да капейкі латалі... Ды, каб ты ведаў, здаровеняк, лопнула ўсё-ўсенькае...

Зноў выцер сьлёзы Мікіта Бурболік, пачухаў патыліцу, што сьвербам сьвярбела, зірнуў на сінія кавалачкі неба дый зноў за нітку ўспамінаў узяўся:

— І жарабок капытамі накрыўся. Празь яго, кажу табе, здаровеняк, і мучуся ось тут. Галота марою прычапілася. Жарабка, кажу ім, галоце, значыцца, вамі клеймаванага, калі кляймо тое зашарсьцела, цыгану прадаў за ніц. А зякраты гапавушнік (гэта ў нашым раёне было яшчэ), каб ты ведаў, і вылупіўся: «Ты, — кажа ён, — варашылаўскага заводу коняў шпіёнам сплаўляеш. Цыгана таго, крывуля, і на сьвеце не было».

— Ён, — кажу я зякратаму, — пад Баранавічамі пазнаў мяне, калі я паноў абозам вазіў, уцёкшы з-пад Жытоміру. Можа, і жарабок той, рэмжа, па мне, і цыган той хаваецца пад Баранавічамі?.. Дык ён мяне, здаровеняк, каб ты ведаў, кулакамі ў жывот ды па сьцяне ціснуць пачаў, кажучы: «Кляймо наша нідзе ня зьлезе, знойдзем варашылаўца, а табе, кулацкая бурболіна, век зь дзецьмі ня бачыцца...» От як, каб ведаў, жыцьцё нашае йдзецца...

— Нялюдзкі й глухі, як чалавек, гапавушнік зякраты, каб яму калом зямля! — уздыхаў няшчасны Мікіта.

Доўга яшчэ гаварыў з Бараўцом Мікіта Бурболік, і ягонае апавяданьне-ўспамін, як тая зрэбная нітка за вухам, усё глыбей і глыбей уядалася ў хворае сэрца маладога настаўніка Бараўца.

* * *

Вельмі ўжо вялікая няпраўда жыве на сьвеце — і ў самым маленькім, і ў самым вялікім.

І вазамі гора таго ня вывезеш. А можа, і вывезецца калінебудзь?

О, каб заварушыўся пыл збуцьвянелых касьцей, каб падняліся паточаныя касьцяедамі галовы-чарапы, каб падняліся ды сталі тварам да сонца жывасілам закапаныя душаедамі беларускія душы! І каб усе яны, падымаючы вялізарнае гора, сказалі магільным голасам:

— Вось яна, вялізарная беларуская праўда! Бярэце яе, браты, і сьвету паказвайце!

— Глядзеце на яе, душагубы, і падайце плашмя на сплямленую вамі зямлю!..

Сон Зьнябыціча

У кутку, на скарэлым ад крыві гнілым памосьце камэры нумар тры паміраў, прыкрыты лахманамі, чалавек — малады аграном. Трымаючы руку над ягоным сэрцам, настаўнік Цімох Баравец плакаў і прыгаворваў:

— Сьпі, дарагі Зьнябыціч... Сьпі, пухам табе будзе нашая зямелька...

Калі ж чалавек сканаў, усе перахрысьціліся.

Баравец, нічога не гаворачы, выняў з кішані некалькі шматкоў зашмульцанай паперы і сказаў:

— Няхай будзе помнікам яму запісанае зь ягоных вуснаў:

«Чалавек пакінуў усё. Узяў толькі, як гаварылі суседзі, невялікі акраец хлеба, слоік мёду ад пчолаў свае гадоўлі й пляшку бярозавага соку, каб смагу было чым прагнаць у дарозе. Узяў і пайшоў...

Чужыя людзі, грабучы дабро хаты, знайшлі ў скрутку бярозты сьпісаны аркуш паперы. Пісьмо было чыстым, ураўнаважаным, літары — буйныя, выразныя. Глядзіш і думаеш: пісаў чалавек стараючыся, нібы вякам пакідаючы словы свае душы. І палажыў жа не абы-дзе, а за абразамі працы славутых мастакоў Бацькаўшчыны: за абразом суцэльнае фігуры Хрыста з паднятай для дабраславеньня правай рукой і круглай зеленавата-блакітнай дзяржавай (зямной куляй) у левай і за абразом кампазыцыі на тэму змаганьня архімандрыта Міхала з д'яблам...

Наверсе на тым аркушы было напісана: «Сон Зьнябыціча».

Баравец уздыхнуў, яшчэ раз перахрысьціўся, падняў над галавою шматок паперы і, паказваючы пальцам, сказаў: «Бачыце, гэта напісана самім Зьнябыцічам, запісана ўсё тое, што ён бачыў у сьне ды што запісаў на загад свайго прадзеда, які ў сьне прысьніўся».

1

...Прадзед Лукаш узяў мяне за руку й падвёў да вакна:

— Бойся Бога, праўнук, і не гняві мае крыві, — глуха сказаў ён, паказваючы на вялікі квяцісты сад. — Хто дазволіў гэтым людзям глуміцца над сьвятымі дарамі? Хіба ж не абліваецца крывёю сэрца тваё, гледзячы, як валяцца пад сякераю на грэшную зямлю поўныя жыцьця й соку моцныя, маладыя дрэвы? Кайся, мой праўнук!

Прадзед перадаў у мае рукі невялікі абраз Хрыста й загадаў перад ім укленчыць.

— Маліся! Душа твая знойдзе мяне ў пушчы, калі цела будзе вартым літасьці, — сказаў і зьнік.

Малітва запоўніла й апанавала ўсю маю істоту. Я ня бачыў і не адчуваў нават свайго глыбокага дыханьня. Не істота, а душа, здавалася, ахінала мяне — гэтакая незямная чулася лёгкасьць. От-от узмахне нябачнымі крыламі цела, страціўшы звыклую вагу, і панясе душу ў празрысты блакіт, туды, дзе ў векавечнай згодзе й паслухмянасьці, аддаўшы сябе няўяўнай сіле сьвету, нячутна й таямніча абходзяць свае арбіты мільярды велічэзных, пазнаных і не пазнаных яшчэ розумам чалавека нябесных целаў.

Яшчэ адна малітва, яшчэ... І душа мая ў густой вільготнасьці аблокаў. Іхныя драбнюткія кроплі абдалі мяне халоднай пякучасьцю, цела ўтраціла раўнавагу, і, з шумам праразаючы паветра, лячу, здалося, у нейкую прорву. Перад вачыма загойдаліся ружовыя пухіры й зьніклі. Прастору запоўніла цьмяна-шэрая смуга балот, потым глуха зашумела пушча. Адчынілася нейкае дзівоснае царства... Пачалі выступаць нячутыя й нябачаныя дагэтуль веліканы-дрэвы, нейкія безгаловыя галабокія людзі, даўгахвостыя, чырванакрылыя дзюбастыя птушкі й чорныя сьмяротныя дзіды. Раптоўна ўсё гэта зблізілася й страціла свае першапачатковыя формы.

Ізноў цемра й пусьціня.

Іду ў невядомым кірунку. Іду вобмацкам. Цела адчула пякельную гарачыню: зь зямлі вырасьлі напаленыя дачырвана зялезныя слупы, а вакол слупоў — залатая сьцежка-апаяска...

2

Іду апранутым у мантыю славы. Іду не адзін: павольнай сьвяшчэннай хадою вядуць мяне па залатой апаясцы сівабародыя, удумлівыя апосталы. Апаяска падымаецца ўгору й пера-

твараецца ў залаты абруч на высокай і стромай гары. Па-над гарою, як рукою падаць, — агністае сонца. Вось яно зь лёгкасьцю пушынкі спадае проста на мае далоні, і я прачытаў на срэбнай ліщьве выбіты чорнымі літарамі такі надпіс:

Хто з паўсотні разоў абнясе мяне, ідучы краем залатога абруча, навокал гары, пераадолее равучыя падуны скалістых лёхаў і не ўпадзе ў зманлівы вір бяздоннага мора ў нізе гары, той здабудзе вечную славу, і ніколі не зазнаюць гора й няшчасьця ягоныя нашчадкі. А хто сацьмее ад нуды й страху, ня выканаўшы ўмовы, упадзе ў страшэнную няласку, і ягоныя нашчадкі ніколі не пабачаць сонца...

Апошніх слоў прачытаць я ня мог, бо сонца моцна асьляпіла вочы. Павярнуў убок галаву, і вочы міжвольна зірнулі на пеністыя хвалі віру, а вушы пачулі такое: «Сьмерцяй жыцьця не паправіш, а сьмерці ня мінеш».

Апосталаў ужо не было. Адольваючы падуны, сам набліжаўся да апошняга круга. Густыя хвалі ветру пачалі згінаць галаву. Моцна захістаўся залаты абруч. Шукаючы ратунку, рукі хапаліся за гострыя выступы скалаў. Задрыжэлі сьціснутыя жахам грудзі. З вачэй выкаціліся буйныя гарачыя сьлёзы. Замест сонца на далоні левае рукі забілася нейчае акрываўленае сэрца і пасьля трох моцных удараў пульсу прамовіла:

— Не губі мяне, Зьнябыціч! Я вырвана з тваіх грудзей... Бачыш родную кроў? Я ж так хочу жыць... Не давайся ў рукі сьмерці!

Перамагаючы сілу густога ветру і зьмярцьвелы стан цела, узьняў я галаву да блакітнага неба і моцна-моцна, ад жаху, крыкнуў:

— Ратуй, Божа, душу грэшнага Зьнябыціча.

3

У глыбіні старадаўняй пушчы, каля вывернутага навальніцай магутнага дуба, пластам ляжаў чалавек. Ягоную галаву ахінала махрастае карэньне скалечанага дрэва. Зь вялікага насыпу тырчэў глыбока ўбіты асінавы кол, густа акручаны іржавым калючым дротам. На зямлі, каля самага кала, ляжала ўмітуські трынаццаць вехцяў чартапалоху...

Прачнуўшыся ў цяжкіх перадсьмяротных сутаргах, чалавек ледзь-ледзь выказаў апошнія думкі:

— Гэта-ж... помнік злой сіле... нячыстаму духу... Бачыш... якія моцныя карані... ня выратавалі магутнага дрэва... А можа й я не памру, чалавеча?.. Праўда?..

— Не, не памрэш... — сказаў я, не падумаўшы... І моцна сьціснуліся кулакі. А хіба сьмерцяй жыцьця не паправіш, калі сьмерці не мінеш?..

Я ўкленчыў перад целам нябожчыка.

Перада мною ізноў зьявіліся вобраз Хрыста й моцная постаць прадзеда Лукаша.

— Бачу, праўнук, што сэрца тваё не апаганенае й душа не прадаецца д'яблу. Сад загоіць раны й зацьвіце яшчэ! Зацьвіце! Жыві, але помні сьвятыя словы і перадай братом: «Жыцьцё папраўляюць сьмерцяй».

Сказаў і зьнік. Я пачуў магутныя грымоты і ўбачыў чырвоныя языкі маланкі. Гэта пачыналася грозная навальніца. Але не яна прабудзіла мяне: я сам прачнуўся. Прачнуўся й пайшоў. І не адзін пайшоў — з братамі, і сьцежкамі братоў...

* * *

Цімох Баравец падняў апошні шматок паперы й сказаў:

— Бачыце, тут ёсьцека гэтакая дапіска: «Запісаў пакуты свае душы па наказе прадзеда Лукаша на памяць людзям беларус Віталі Зьнябыціч з-пад Пцічы».

— Прашу перахрысьціцца, — сказаў Баравец і сеў каля цёплага цела нябожчыка.

* * *

З маленства меў я немаведама адкуль, як і калі прыйшлы й вычувальна ўрослы страх да нябожчыкаў. І жаль у сэрцы ня тоўпіўся ніколі. Быццам тая смаляная доўбня (няхай яно сабе катораму лёгкаму сьмяюну й сьмешна ад таго робіцца, а мяне самога й цяпер вусьціш праймае ад тамтаголешняга вычуваньня), стукнула ў маю патыліцу гаворка аб чалавеку, Богу душу аддаўшаму. Не бяруся й не скажу, што гэта ня йдзецца ад людзьмі казанага ці на свае вочы калі-небудзь бачанага... Гэтым разам, аднак, страху ня меў ніякага: ня тое што на яго забыўся і ўжо не баяўся яго, не, ня меў і (думаецца гэтак цяперака) толькі праз тое, што ён не зь якога там водшыбу падпаўзаў і па чарзе ў сэрца цаляваўся, а ў заплеччы мясьціўся ды з усімі, сьціснутымі камяным перавяслам, раўнёю надта братаўся...

Стаяў і пазіраў я на незаплюшчанае левае вока, цьмяна-сіняе й вільготнае, не раўнуючы як той кавалачак неба, што прабіваўся спадыспаду даўгіх цырубалак ды, разразаючыся замуранымі марозам кратамі, застываў і губляўся ў павольных сколыхах ліпкае пары, што выплывала яму насустрач, — зь сярэ-

дзіны навонкі камяніцы. А вока нежывога Церабельца пазірала на мяне, на іншых і ўсё больш і больш журылася ды жмурылася памаленьку: на жывых наракала... і з жывымі разьвітвалася...

Няхай сабе й не дадуць веры, а я ж праўду найпраўдзівейшую скажу: я выразна чуў мацерыну гамонку з суседкаю Цыцыляю Крэзіхай (яшчэ раз скажу, што толькі той ня дасьць веры, хто ніколі ня бачыў на вочы вачэй страхотнае жывое сьмерці за вачыма родных і блізкіх):

— Памрэм, Зенячка, і почату па сабе не пакінем, — уздыхала Крэзіха.

— Два ж вякі, Цыцылечка, каб і жыў, дык ня выжывеш... Малі Бога, каб сваёй гэта сьмерцяй памерці. Ось што, любенькая, — разважала маці суседку, — каб жа яно ды ведана...

— Як тыя дубкі былі, не дасі зманіць, Зенячка, а сухоты салдацкія бедненькім вочы на сьвет зачынілі, — плакала шчупленькая Крэзіха, нідзе не забываючыся пра сыноў-дубкоў.

— То ж бы яно то, любенькая... Якога насланьня нямашака толькі на таго чалавека, — яшчэ больш разважала Цыцылю маці. — Чапі яго, дык яно табе й пачне ўчашчаць. Не адкараскаешся і асінаю не заломіш. Ззамаладу сьсівелі, а дзецям, не сьвяціўшы, сьвет зачыняецца. Цяжанька маладому з жыцьцём без пары разьвітвацца.

* * *

Гэтакая цішыня была ўладавалася, што калі б і муха праляцела, дык шумам послух натрудзіла б...

Адзін-аднюсенькі цыбаты арыштант, той, які трымаўся так, як бы яно там нічога ніякага й ня сталася, ды ўвесь час лавіў шырокімі далонямі бурбалкі, што адрываліся ад мокрае столі, лежачы на купленым за дзьве пайкі-гарбушкі й адзін «беламорканал» месцы каля саменькага вакна, ня вытрымаў цішыні й неспадзеўкі, не паварочваючы квадратовае, нядаўна якімсьці цудам паголенае галавы, вымуляў сухім цагельным голасам:

— В церковь тюрьму превращать собираетесь, сердцебольные? В колокола звонить изволите, младенцы невинные?

З кутка, адтуль, дзе ляжала яшчэ цёплае цела нябожчыка Якуба Церабельца, выціснуўся доўгабароды прыземісты сухатвары селянін, чыімі нагамі, відаць, ці не найболей тапталася дно не аднае, а шмат якіх — і вунь колькіх — камяных дамавінаў у турмах савецкіх. На глыбока ўпалых яго вачох блішчэлі сьлёзы. Усе пазналі адразочку, што чалавек меўся нешта сказаць, от як бы гэта, здаецца, і было напісанае на ўсім чалавечым твары, палушчаным ня сіверам сакавіковае беларускае раніцы, а моцна прыпалымі да скуры грызкімі, пякучымі сібірскімі вятрамі, што ўядаюцца ў жывое, сушаць яго й пасыпаюць перхаціньнем крамянае, колеру яблынавага цьвету, перад гэтым моцна надухмяненае пахам зёлак, чысьцюткае цела чалавека, народжанага й выраслага няйначай, як на беразе волялюбнага, плыннацечнага нашага Нёману... Добра відно было, што чалавек вельмі ж сіліўся ўтаіць нутраную ўзварушанасьць, і нельга было сказаць, што гэта яму не ўдавалася, — удавалася-такі, і барджэй не ад недасілу, а якраз — гэта як піць даць — ад натужлівага перасілу на заціснутых да сіні тонкіх губах выступіла ў міг вока нейкая жаўцізна. Раптоўным узьнёсам левага рукава шарачковае саматканкі-кашулі (ды ім самім палатанае) змахнуў сьлязінкі ды гэтак моцна, з глухім шумам, выштурхнуў паветра й вышэйшым на вачох зрабіўся.

Мікіта Бурболік (гэты ня дасьць маху, каб і не хацелася яму, а спасьцерагчы спасьцеражэ: вока ганчарова ня зблышыць і ведае, да чаго яно ўсё йдзецца) аж вухнуў і лупянуў, як у той сук хваёвы, свае моцныя словы, скіраваныя да таго сэрцаць-верда турэмнага, што з загубленага маладога жыцьця ды з царквы Божай кпіць адважыўся:

— Па нюхмарцы Цыбатага Валанцая, Зялёнка! Плюшчы...

Цыбаты Валанцай усхапіўся, выпрастаўся й затросься, відаць, вельмі баяўся. А доўгабароды Зялёнка прыжмурыў вочы дый папытаўся, але так, як бы гэта перад ім стаяў ня нейкі там рыштант-даўгуль, а нейкая гідкая звадыяшка-вядзьмарка:

— А ты, нелюдзь, жыць яшчэ хочаш?

Ні лагоднага, ні благога не сказаў Валанцай на тое. Лагоднае выдала б ня тое што нейкую там падатлівасьць, але больш невыгоднае — баязьлівасьць, і тады б ужо квадратовая голеная даўгулёва галава, што мулялася на тры кархі над галавою Мар'яна Зялёнкі, мусіла б уважыць на ўсё й перапрасіцца — прызнацца ў непашаноўлі, а сказанае назадзёр распаліла б яшчэ больш гарачку й не аднаго Зялёнкі, але й тых іншых, што зацяліся й прыглядаліся да ўсяго, што пачынала дзеяцца.

Гэтакае, мусіць, думалася Валанцаю, і праз яго даўгое тонкае тулава паволі пачало паварачацца да вакна, далей адступацца. Мар'яну ня церпелася: адштурхнуў нейкага маладзюка, уціснуўся ў сярэдзіну й апярэдзіў даўгуля, сказаўшы гэтакае:

— Дык, значыцца, жыць ня хочаш?

— Не, — сказаў даўгуль для адчэпнага па-нашаму, па-беларуску.

— Якое ж гэта «не»? — сьціскаючы сківіцы, перапытваўся Мар'ян, крывячы даўгуля.

— Не хачу... — як уколаны, крыкнуў неспадзявана Валанцай і яшчэ з большай нецярплівасьцяй і моцнівам папытаўся, выцягваючы ўшчэмленыя плячыма арыштантаў рукі:

— А табе хочацца?.. Хочацца — пытаюся?

Зялёнка не спужаўся, але Валанцаеў крык зьверху, над галавою, здаўся ў разварушанай шумам цішыні крыклівым плачам мізэрніка, і злосьць адлягла ад сэрца:

— Ня хочаш?.. Ты ж і не жывеш, шашаль паскудны, а зь нябожчыка й царквы Божае кпіць адважыўся. То ж чалавекам вунь якім быў Якуб Церабелец, а ты — мярцьвяк сьмярдзючы. От што скажу табе я...

Шчырыя ўпікі старога Мар'яна Зялёнкі разжалілі, здаецца, Цыбатага Валанцая. Ён ушчаў гаворку. Можа, яно сказанае ім і праўдай вялікаю было? Хто яго ведае. Самі, чытачы, судзеце, вось яно:

— Не дакарай, Зялёнка. Не мярцьвяк я, а жывы мярцьвяк, гэта й мацней, і праўдзівей... Разумееш, Зялёнка? І я, і ты, і ўсе мы — жывыя мерцьвякі й нічога большага й лепшага. Ня сьмешна й ня сорамна, а балюча й прыкра... Надта прыкра робіцца нам ад гэтага. Разумееш, пытаюся, Зялёнка?

Мар'ян Зялёнка маўчаў, прыслухоўваўся й думаў, адкуль усё гэта гаворанае бярэцца. Расчулены Валанцай прадаўжаў гаворку:

— А тыя (ведаеш, каго маю на ўвазе), што ператварылі нас у жывых мерцьвякоў, дахадзягаў турэмных, як на сьлізоту, з агідаю на ўсіх нас пазіраюць...

Мар'яну ад гэтага рабілася лягчэй: ён лагаднеў, мякчэў, а на ягоных старых вачох навіналіся сьлёзы. Яны наліваліся, буйнелі, цяжэлі і ў адну вялікую на воку зьліваліся. І Мар'ян ужо глядзеў не вачыма, а круглымі сіняватымі плямкамі. Глядзеў і нічога ня бачыў. І от, калі гэтыя плямкі выпукліліся ў павеках (плямкі цяпер нагадвалі дзьве бліскучыя бурбалачкі), разьліліся й сьлязьмі пакаціліся па сівой барадзе Мар'янавай, Зялёнка ўбачыў, што Валанцая перад ім ужо не было: той сядзеў на гнілым памосьце й пачатае перад гэтым гаварыў далей Цімоху Бараўцу, Мікіту Бурболіку — усім, што яго абступалі.

— І дагэтуль, дома, жывымі мерцьвякамі былі мы й прызнавацца самім сабе баяліся, ад людзей і саміх сябе хаваліся й уцякалі. Сьмерці чакалі, разумееце? Ня горшых, а лепшых гэтая сьмерць вырывала. Ось і тут тое самае: і хаваемся, і ўцякаем, самі сябе баімося. Адзін на аднаго наракаем, усё нечага шукаем, ня верым нікому... Не з царквы Божае й не зь нябожчыка Якуба Церабельца, сьвятой памяці, кплю я, а з самога сябе, разумееце. Зайздрошчу памерламу. Яму — адно, Божае, а мне і ўсім нам, усім чысьценька — д'ябальскае: з турмы ды ў турму. З Бутырак на бацькаўшчыну, называецца, прывезьлі мяне. Радуйся, чалавек... Дома сядзіш, значыцца... Шчасьлівы чалавек Церабелец...

Зялёнка выцер рукавом сьлёзы, абцёр бараду і проста, як бацька да сына, зьвярнуўся да выгаваранага Валанцая:

— Думаў, што благі, што цуруеш нешта. Ня гневайся, праўда твая, чалавеча: не праўдзівыя, а жывыя мерцьвякі мы... А жыць, ведаеш, нець як хочацца! А ну ж? Як ты яно думаеш? — крануў рукою Мікіту Бурболіка і ўжо сваімі чыстымі вачыма зірнуў на Цімоха Бараўца.

— Я табе, каб ты ведаў, здаровеняк, ось што скажу: гарлач патрэсканы — жыцьцё нашае... Клей ня клей, а яно, здаровеняк, усё болей лопаецца...

Бурболік, відаць, і яшчэ нешта здумаў, вельмі ж ужо гаваркім быў чалавекам, але ў гэты момант забразгалі ключы, адчыніліся дзьверы, і ў камэру нумар тры ўвайшлі тры чырвонагаловыя чорныя скуранкі. Былі яны вельмі падобнымі, аднак кінулася мне ў вочы першая й найдаўжэйшая... Яна таксама на некага пільна ўзіралася, шукала некага...

Камяны мяшок тужэй заціснуўся, звузіўся, і рабілася ўражаньне, што ось-ось паясьніца ягоная перацісьнецца, і ён трэсьне, узарвецца й сьледу па сабе не пакіне.

Арыштанты маўчалі й чакалі...

Вырванае дзьвярыма халоднае паветра калідора выдалася мне ледзяным і надта калючым, сэрца ёкнула й моцна закалацілася.

— «Рыжы»! — сказаў я сабе самому. — Той самы, што да «Шчупака» заходзіўся й «Маркса» майго бяз вокладак з пакою вывалак...

Апошняе (а можа, толькі першыя словы апошняга, ня ведаю, не заўважыў і, здаецца, ня чуў самім сказанага) гаварылася, відаць, уголас і добра пачулася Цыбатым Валанцаем, бо ён адразу, сьціскаючы мой правы локаць, пачаў шаптаць на вуха:

— Ён, той самы... Памятаеце?

Гаварыць я ня меў ахвоты ніякае й нічога на тое не сказаў, а чалавек мне другім наваратам:

— Кажу вам: той самы, не памыляецеся...

— Вы гэта пра каго? — пацікавіўся я нарэшце.

— Пра гэтага Рыжага, што ў вокны з двара страляе, калі надта ўзіраюцца. Як тая вужака, спадцішка падпаўзае. Нешта ня так даўно ў вока маладому пацэліў. Бяз сэрца камянюка рыжая! — выгаварыўся Валанцай і локаць мой з далоні выпусьціў.

— Не пры мне, — кажу яму, — было яно. Ня ведаю.

— Ён... Ён... Усе ведаюць...

Сказаўшы гэта, чалавек паціснуўся да дзьвярэй і сьпінаю засланіў Рыжага. Я ўжо ня бачыў прыкрага твару, і першае непрыемнае ўражаньне пачынала сьцірацца, але, як на злосьць, кішэньнікі моцна зарагаталі, засьвісталі і, не раўнуючы, як тое мяла ў цёрле, закруціліся. Моцная руханіна была гэтакай неспадзяванай і раптоўнай, што я й не агледзеўся, як апынуўся перад прышлымі скуранымі тыпамі. Сэрца яшчэ мацней закалацілася й выразна гаварыла мне:

— Ён... Ён... Ён...

Рыжатварая чорная скуранка расхінула скручаны лісток паперы і, паднёсшы яго леваю рукавіцаю да самых вачэй, пачала голасна чытаць:

— Тимофей Боровец, Никита Бурболик, Мариан Зелёнко, Яков Теробелец — с вещами!

Камэра нумар тры павярнула галовы ў той кут, дзе ляжала цела нябожчыка. Старэйшыя перахрысьціліся.

Такое цішыні ніколі перад тым ня бачыў. Гэта была страшэнная, турэмная цішыня! Парушыў яе неўзабаве той самы Цыбаты Валанцай:

— Якуб Церабелец не дачакаўся... Ягонае халоднае цела й гнілыя лахманы — тутака. Бярэце... Душа — на небе, ня возьмеце.

Жылістыя кулакі Валанцая

Спачатку нябожчыка вынесьлі, а праз нейкі час павялі пакліканых «с вещами». Не параскашнела, а пацясьнела, бо нават і тыя, што пад памостам цеперся ляжалі не вылазячы, «найсьвяжэйшыя», якія йшчэ, як казаў той, «ветрам пахлі», пакараныя самімі арыштантамі (гэта, значыцца, тыя, што «канстытуцыі» камэрнае вызнаваць ніяк не хацелі ды й вухам не вялі, калі ім пра ўсталеныя парадкі жыцьця ў турэмных умовінах не аднойчы гаварылі), слабюкі, дахадзягі ды й такія, што надта ў зацішку туліцца любілі, павыпаўзалі ды ў стойма стаялых неяк уцерліся.

Калі ж гаворка ўляглася ды сьцішыліся шэпты-сэймікі асьцярожных і баязьліўцаў, нехта раптам ізноў абазваўся. Чалавек, папраўдзе кажучы, не гаварыў, а малоў нейкія брэдні, і праз гэта самае ніхто, здаецца, ня ўзяў таго й на маленькую ўвагу. І не было чаго й дзівіцца: гэтулькі ўжо гаварылася й чулася, рабілася й бачылася, што, калі б і сьцены трэснулі, дык не было б тое, мусіць, вялікаю навіною.

— Эт, меле абы малоць... Пайку, відаць, у запасе мае, дык і цешыцца. Пасядзіш — прыпухнеш... — гаварыў ні то мне, ні то самому сабе, ні то лапатуну-«пайшчыку» шчуплацелы й немалады ўжо чалавек, выцягваючы з-пад маіх ног маё ўласнае паліто, падзёртае і вельмі ж ужо зашмальцаванае сьлізотаю сьмярдзючага макрацінья.

— Хочаце сказаць: «ветрам пахне» навюк?.. — пацікавіўся я асьцярожна.

— Не навюк, а турэмны псюк, — трапіў чалавек у рыфму й сам ад таго засьмяяўся. — Гэты, як сам ён кажа (верыць жа цяперашнім часам чалавеку нельга), — бывалы, арыштант-тубылец. Зь месяц нейкі ўжо, як сюды яго ўпхнулі. Ляжыць сабе й ня дбае: як на печы за комінам, пад памостам валяецца..

Казанае шчуплацелым дакацілася да вушэй чалавека з брэднямі, і той узяў дый агрызнуўся, і не абы-як, а сьмела й рызыкоўна:

— Радзіў бы язык за зубамі трымаць наўчыцца! Як і той Церабелец, бачу, контррэвалюцыю расьпісваць умееш?

Шчуплацелы паблажэў ад злосьці, але зацяўся й змоўчаў. Не чапай, кажуць, ліха, калі клопату мець ня хочаш. Гэтакае, відаць, сіганула ў ягоным одуме і язык адразу прымкнула.

Убачыўшы, што чалавек не падаў і голасу, рызыкоўны «пайшчык» асьмялеў яшчэ больш, але (гэта заўважылася ўсімі, нават і найбольшымі кішэньнікамі) кінуўся на шытыя белымі ніткамі хітрыкі:

— Праз такіх, як ты, языкатых, ці мала пакутуе... Хіба й тутака стукаеш?.. Га?

Уціхаміраны старым Мар'янам і папраўдзе расчулены сьмерцяй няшчаснага Якуба Церабельца, Цыбаты Валанцай, якога не было й навідавоку, уклініўся ў непрыемную калатню «ту-

рэмнага псюка» й коратка секануў, падняўшы жоўтыя кулакі над галавою зякратага чарнамаза:

— Каго ганьбіш, гідота? Сам ты стукач языкаты! Ведаю... Усё ведаю!

Цяжкія, жоўтыя, жылістыя кулакі Валанцая апусьціліся. Валанцай прысеў, ухапіў упол пісклівага чарнамаза, падняў яго над перапалоханымі душамі «жывога куля», цяжка ступіў тры крокі й шпурнуў яго плячыма на тоўстыя замарожаныя краты вакна.

— Жалься, гідота, Рыжаму... — застагнаў Цыбаты Валанцай і адразу падаўся да дзьвярэй. — Сам паклічу... Сам... Бярэце, нягоднікі... Бярэце!

Прыбіты чарнамазы асунуўся на памост, захроп, завойкаў і сьцішыўся... Стараста камэры нумар тры, сіваваты лекар менскае лячэбніцы, нічога нікому ня кажучы, наблізіўся да скурчанага арыштанта й пачаў расшпіляць ягоную кашулю, каб паслухаць, відаць, ці жыў чалавек. Падбіты неспадзявана ачуняў і страпянуўся. Яму, мусіць, здалося, што рукі Валанцая дабіраюцца да ягоных грудзей, да сэрца. Ён моцна, як падпечаны чырвоным зялезам, закрычаў, мігам павярнуўся тварам да вакна, учапіўся рукамі за сьлізкія палушчаныя ад іржы краты і ўшчаў вар'яцкае галашэньне. Баязьлівы, застрашаны лекар намагаўся вычапіць чалавека зь небясьпечнае мясьціны: ён жа ведаў, чым пахла вакно знадворку, аднак, гэта яму ніяк не ўдавалася. Стоячы за сьпіною непрытомнага чарнамаза, нэрвова тоўкся на адным месцы й бездапаможна махаў рукамі, прыказваючы адно й тое самае:

— Ну, ой!.. Рыжы!.. Ну, ой!.. Рыжы!.. Куляй Рыжы стрэліць... Ну, ой!..

Сіваваты лекар менскае лячэбніцы, стараста камэры нумар тры, не дагаварыў апошняга слова: тры ўзапар стрэлы перанялі ягоны ўгавор... Рукі апусьціліся, і вялае, старое, вымучанае турмою цела абрынулася на мокрую, халодную камяную падлогу. Побач зь ім прымасьцілася, адваліўшыся ад сьмерцяноснага вакна, і цела чарнамаза-«пайшчыка», што радзіў «язык за зубамі трымаць наўчыцца...»

А Цыбаты Валанцай, здавалася, і ня чуў нічога, і ня бачыў... Ён усё стукаў жылістымі кулакамі ў глухія зялезныя дзьверы, ламаўся й стагнаў, сьціскаючы шчэлепы й скрыгочучы зубамі:

— Бярэце гідоту!.. Бярэце!..

І рыжаскурая гідота прыйшла.

— Кто?! — зазьвінеў голас Рыжага.

Гузатвары Касуля (гэтак было празвалі арыштанты калідорнага начальніка за тое, што вокам да «ваўчка» любіў часта прыкладацца) спрытна выкарыстаў маўчыню і ўткнуў, як кажуць, у бяду сваіх пяць капеек:

— Камера этая, таварышч дзяжурный камендант, самая, как вам так сказаць, не ўспокояюшчая... Адкрывенно гавара, ядзіная із шумяшчых, таварыш камендант дзяжурный...

Злосны «камендант» і вухам ня зьвёў. Што яму да тых «пяці капеек» нейкага там калідорнага! Сам ён зубы зьеў і ўсё чыста ведае. Усякі б сказаў, зірнуўшы на яго пажованы грахамі жоўты твар, што найбольшую ў сьвеце манюку, калі б тая й сьляпой была, гэтая двухногая істота ня хібіць і адразу па вачох пазнае.

— Кто и что, спрашивается?! К ответу, староста!

— Я... — цяжка азваўся Цыбаты Валанцай.

— Юдовин?

— Не. Апанас Галёнка.

— Ты, стало быть, в окно ломился?

— Не, — гаварыў, трасучыся, Галёнка-Валанцай. — Я прыбіў твайго стукача, а ты забіў і яго, і лекара Юдовіна...

Камэра нумар тры расступілася, і вочы Рыжага ўперліся ў мерцьвякоў...

— Камера лишается передач и прогулок. Спровоцировавшие стрельбу будут строго наказаны...

І собіла ж таму Галёнцы-Валанцаю жывым на ражон палезьці!

Целаскурыя й плацяныя чорненькія сабачаняты й добры дзяцел

Упраўка не на мае вочы рабілася — і ня чуў, і ня бачыў. І вельмі добра, што й ня чуў таго, і ня бачыў. І пытацца не пытаўся б, каб ня той самы шчуплацелы, празь якога ўсё й загарэлася, расказаў мне збольшага па трэціх пеўнях (голас певуноў даходзіў здаля, зь седалаў гаспадарскіх хлеўчукоў за мураванымі сьценамі турмы). От як яно ўсё выйшла.

— Я, — кажа, — лажыцца ня буду, пастаю, пакуль трасца ня ўляжацца, а вы, бачу, высілкаваліся, лезьце й пасьпеце, пакуль што-якое... Не гідкуйце: адсуньце, прытаўчэце й лажэцеся... Не скажу, каб гэтае «адсуньце, прытаўчэце» на рыготы ня брала: пры першай знаямосьці з табунамі разбазыраных тлустых во-

шай і акрайчык у горла ня лез, але ж голад — ня цётка, а сон — ня родны дзядзька, нікуды ня дзенешся, калі ногі й самі цябе ня слухалі, і самі сябе трымаць адказваліся, а зялёныя пухіры лявоніху на вачох модна выдрыгоўвалі. Як ні казырся, а палезьці-такі палезеш. І калі чужы чалавек табе спагадвае, дык самому сабе ўжо й Бог вялеў. Палез і калачом пад памостам скруціўся. І што ж вы, даражэнькія, думаеце? Упаў як пшаніцу прадаўшы? Дзе вы бачылі! Цімала тузаўся, і ніякае вам наўды: калі турэмная вош каторага ўзьлюбіць, дык ніякае абароны ня будзе ад яе мець чалавек, каб і дробным макам рассыпаўся, і нават покнуў ад нясьцерпу. Ты іх каўшом грабі, а яны табе й паўзуць, і сыплюцца, і, ведаеце, якіх толькі нямашака: і бялявыя, і саўсім белыя, бялюткія нават, рудаватыя, рудзенькія, шэранькія, папялковыя, жоўценькія, а часам і нейкія сіняватыя пракінуцца, — адным словам, усякае масьці. І, каб яны цяміліся, не мізэрныя, а ёмкія, праўда, бываюць і пляскаценькія, гэта што йшчэ скораму добрага не ўвазналі — далікатнейшыя, але ж таксама ня ўломачкі — дзябёлыя, як угрызяноць, дык угрызяноць, аж пад барадою пячэцца, а сьверб той за сьвербам, як шалёны, лятае, ад чуханіны ўцякаючы. І от што вельмі ж ужо пацешна: бываюць гладзюткія — ні тае пушынкі — і надта ж ужо касмаценькія і мякуткія (вошкамі-валасацікамі называюцца, або целаскурыя) — гэта што ў цела ўлазяць і пад скураю сьціхатою доўга сядзяць, і спорна плодзяцца, а тыя першыя — гладзюткія — гэта ўжо плацянковыя і хіба крышачку большыя. Усякіх нагледзеўся. Прытаўкаў, бараніўся, адсоўваў і жменяю з-за каўняра зграбаў, а, баронячыся і зграбаючы, прыгледзеўся й абыўся: поўзалі — і ня чухаўся. І от што мне думалася — ды ня толькі мне, усім, відаць, думалася: і як гэта, прывыкшы, бяз вошай і сьвербу жыць асьмелішся некалі? І яшчэ адно і ўжо найцікавейшае дзіва: не відно было чырвоных вашанкоў, а ўсё толькі тыя самыя вошы й вошкі, драбнейшыя й буйнейшыя. Ці не турэмнага заводу, ці мацнейшымі загрызаліся. Нешта ж нейкае мусіла быць. Як вы думаеце? Дык вось, думаў я, думаў пра ўсё гэтае дый заснуў. І ні плацянковых, ні целаскурых ня чуў і ня бачыў. Адно, што ў сьне бачылася, дык гэта чорненькія калмаценькія сабачаняткі і ўсе — з хвосьцікамі ў калачык і харошанькія, як тыя падсмажаныя пампушкі. І ніводнае сабачанё не ўкусіла, усе шчакатлівымі язычкамі лізаліся. А як сабачаняты пабеглі й немаведама дзе дзеліся, прыляцеў вялікі дзяцел і ў правае калена дзеўбануў тройчы:

— Уставай, уставай, чалавеча!

— Разумнік які знайшоўся! Сам, мусіць, масьціцца лабунішся? — такое сказаў я вялікаму дзятлу.

А ён мне другім наваратам:

— Сьцеражыся, чалавеча! Бачыш, як цябе апанавалі?

І каламі б не падвярнулі б, каб ня тыя вошы, што на правым воку ёмка ўладаваліся. І выелі б, каб ня той добры дзяцел, што ў калена стукаў.

А шчуплацелы тады мне й кажа:

— І ў хаце з гэтакім смакам ня спалася...

— Як пшаніцу прадаўшы, — кажу яму.

А ён мне сваё, таўкучы плацянковых:

— І ў тры пшаніцы з каноплямі не ўбярэшся, каб да трэціх пеўняў пры гэтакім вашаедзе спалася.

— І кусацца не кусаюцца, — сказаў я дзеля прыклёпу.

— Вы, — кажа шчуплацелы, — на рукі свае зірнеце...

Зірнуў і, калі б гэта ня ў менскай турме, веры б сабе ня даў: паміж пальцаў касмаценькія й мякуткія клубочкамі ладнымі да скуры прысмакталіся. І толькі пазьней, ськінуўшы кусьлівых савецкіх тубыльцаў, пачуў непрыемную пякучую гарачыню.

А шчуплацелы мне й кажа:

— Упраўляліся нядоўга: і жывых, і забітых пазабіралі. І мяне самога цімала валтузілі.

А пазьней і ўжо на саменькае маё вуха дадаў:

— Калі есьці не дадуць, сьціхаты ня будзе...

— Абы вошы збыліся, а без «баланды» неяк выжывем, — гэтым хацелася мне расквітацца з ушчатаю шчуплацелым гаворкаю.

«Пан» Баніс і «прах-вэсар» Пыжык

На камяным лапіку сядзелі галасьпінныя. Спрасонку ня надта ўвазнаеш усіх адразу, з-пад памосту праз галовы на іх гледзячы, хоць гэтае ўвазнаньне ня вельмі ўжо мне й карцела, аднак я, каб адкараскацца саўсім ад шчуплацелага, што смаліцаю ўлазіў у маю сьціхату, і нічога ніякага не гаварыць на ягонае «а што вы скажаце пра гэтую галёнку?» («смаліца» мела на ўме Галёнку-Валанцая), удаў, што не пачуў папытанага, і думанае пра галасьпінных на камяным лапіку сказаў самому сабе ўголас:

— Хай забаўляюцца, адно каб новага закалату не рабілі...

— Добрая вам у мокрым карцары забаўка... — прычапілася да слова «смаліца». — Папацёмку ніякі рызыкант ад пацукоў не абароніцца, а самыя «залатушнікі» — гэта ж я сам добра ведаю — вар'ятамі робяцца...

— Я, — кажу яму, — пра адно, а вы — пра другое... Вунь пра каго я, — кіўнуў галавою, — што ў бірульках забаўку маюць...

— Што ўдзень сьпяць, а ўначы «агру» раскулачваюць?

— Ня ведаю, — адказаў я дакучліваму чалавеку-«смаліцы». Я не ілгаў, бо такі й ня ведаў, пра што тая мова йшлася. І каб наўчыцца турэмнае мудрасьці ды, «носячы моцна зарубленую яе на носе», як умеў было выслаўляцца крывенькі, пацешны Мікіта Бурболік, стары ганчар з-пад Таўкачэвіч, умела разьмінуцца нават зь вялікімі непярэліўкамі, калі заўтра-пазаўтра прыкруцяцца неспадзеўкі на прыкрасьць, пацікавіўся, прызнаючыся ў вочы:

— І не разумею, што вы мне кажаце: каго й як «раскулачваюць»? Яны ж гэтакія, як і мы з вамі?

— І гэтакія, і ня гэтакія... Торбачнікаў раскулачваюць — гэтак у нас калгасьнікаў празвалі кішэньнікі. Дастане гэта чалавек прынесенае печыва сухароў з дому, сядзе й сядзіць седзьма на торбе — сьцеражэ, каб ня вычапілі з-пад мяккага месца... А кішэньнікі пад памостам седзьма сядзяць цалюткі дзень, слабюкамі й хворымі прыкідаюцца, чакаюць, калі «агра» адлучыцца ці на торбе, чухаючыся, задрэмле. Удзень ня надта ім удаецца, а ўночы, калі чалавек здасца, апэрацыю медзяком навостраным робяць: прарэжуць торбу, выбавяць тое печыва й мелюць... Чалавек прахопіцца, седзячы на пустой торбе, і вачыма лыпае: ні сьледу, ні таго злодзея. А ён, кішэньнік каторы, з тымі сухарамі ў жываце выпаўзе, стане перад раскулачаным і даймае кпінамі:

— Дядя! Пожертвуй сухарик голодному мальчику!

— Гэтыя самыя, што зь бірулькамі? — дапытваюся.

— Гэтыя... І пад памостам нейкіх зь дзесяць, — прадаўжае шчуплацелы. — Нешта за тыдзень перад вамі тое, што кажу, здарылася. Зірнула тая бедная раскулачаная «агра» на кудлатую шэльму і затрэслася: «Цыц, вашапруд карэлы!.. Абармот... Паскуднік...»

Шчуплацелы, відаць, вымавіў усё гэта мацней за таго «раскулачанага», бо, як заўважыў, і сам спалохаўся і, зірнуўшы на мяне, сказаў:

— Не крычэце, прашу вас: пачуюць...

— Хіба ж гэта я вам крычу? — пытаюся.

— Ведаю, што сам я крычу, але ж кажу: крычаць ня трэба — небясьпечна. Нейкі заморак прычапіўся да мяне, — апраўдваўся чалавек. — Усе павар'яцеем, кажу вам... Самі ўбачыце...

— Вам, бачу я, боязна надта, — сказаў от так сабе.

— Чалавек жа ніколі ня выбаіцца, каб і хацеў, — апраўдаўся шчуплацелы.

Блізу ўсе «суседзі» прабудзіліся, але ня ўсё спанатрылі. Галасьпінныя на лапіку мелі вастрэйшыя вушы, пачулі й заварушыліся.

«От і прыкруціліся непярэліўкі... — думалася мне. — Трэба разьмінацца, каб там, дзе вар'яцеюць, з пацукамі ды з тымі «залатушнікамі» ня бачыцца».

Адступіўся й да камянога лапіка немаведама чаго паціснуўся.

— Э-эй, ты, прах-вэсар Пыжык!.. — азваўся да шчуплацелага галасьпінны. — Бірулька на твае штаны йграецца. Чуеш?

«Прах-вэсар» не падаў і голасу, у транты пад памостам унурыўся й трэсься ад страху. І няма чаго й дзівіцца нам: і пра найлепшыя сухары, і пра наймілейшых «аграў» забудзешся, і язык, якім бы ён там даўгім ні быў, прыкусіш, ад галасьпіннага гэтакае пачуўшы. Хай сабе чалавек і не на нейкім там кірмашы, але ж бяз тых штаноў і ў турме кірмашаваць ня будзеш, і пры людзях нязручна, як там ні гавары. Або вось гэтакае надарыцца: прыйдзе чырвонагаловы ды й завалачэ цябе да сьледчага. Трэба ж ісьці з «ворагаў» вылузвацца, каб ад наплясканых злымі языкамі нагавораў адкаснуцца, і ня пойдзеш, калі твае блізкія ворагі з апошніх штаноў перад гэтым цябе вылузалі. Або й такое, пра што і ў сьне сьніцца: выскаліцца той чырвонагаловы, адчыніўшы дзьверы, ды й скажа:

— Дзе там той грамадзянін Пыжык, якому дадому зьбірацца кажуць?

А пазьней, зірнуўшы на галаногага, дадасьць, скалячыся:

— Зь вяшчамі, прыказана.

А бедны Пыжык аблізьнецца, як мыла зьеўшы, і на ўкарочаныя «вешчы» пальцам сваім пакажа... І каля рашкі — «парашы», як тое ў каноплях пудзіла, ківацца будзе.

Гэта ж ня жартачкі! Няшчасьце, дый годзе.

От і мусіў чалавек унурацца, усё гэта загадзя на рабаціньні маленькага востранькага носіка зарубіўшы. Балазе, што ўчарашняе сяк-так уціхамірылася ды без таго карцарнага пацукавіньня абышлося. Але ж і гэта йшчэ віламі па вадзе пісана: можа, усё гэта яшчэ й ачнецца, і прыкруціцца... Хто яго там ведае.

«Сядзі й ня дыхай, — думалася ўнуранаму Пыжыку, — бо як навярзецца новае, дык тады й старое клейка да яго прыпластуецца, каб яго, не пры мне кажучы, заўшыцай аблажыла, і пачне, падсудны Пыжык, твая справа пухнуць. Крый мяне, Божа...»

І гэтак Пыжыкавыя думкі за думкамі беглі наўздагонкі, навыперадкі, шараваліся, разьмінаючыся, і калі ўжо ад разьміну й шараваньня глухлі й шпакляваліся пакусаныя гладзюткімі й касмаценькімі «прах-вэсаравыя» чырвоныя вушы, шчуплацеламу рабілася зябка, яшчэ боязьней, ён тужэй заціскаў матузок на паясьніцы і, таўкучы зубамі дрыжыкі, сакатаў, заікаючыся, усьлед за Банісавым:

— Прах-вэс-сар-р Пып-пыж-жык... гыг-гій-га-а... Бір-руруль-ль-ка-а на-а-а твай-е ш-ш-тан-ны іг-ра-ец-ц-ца...

Бірулька спрытнела й пераходзіла да апошняга, да кірпаносага рагатуна й камэдыянта. Той не забыўся, і перад тым, як падкінуць гладзютка вышмараваныя паячныя палачкі-сколачкі, шмаргануў носам і, кіснучы ад сьмеху, даймаў баязьліўца:

— Пан Баніс не жартуе, таварыш прах-вэсар Пыжык: извольте штанишки на бочку...

Гострыя швайкі разьніка Лаўрэна Пячонкі...

Ня суткамі й не гадзінамі, а часінамі турэмная сьціхата мераецца. І гэта ня то што ўдзень, і ўначы тое самае. Калі не адна трасца, дык другая — меншая ці большая, — а такі возьме й прыкруціцца аднекуль і трасе табе людзьмі, як чорт лазою ці сухою асінаю на высокім буі, апошнія духі з-пад рэбраў выкалачваючы. Не скажу, аднак, каб тая трасца да ўсіх адразу чапалася: і чортава свой парадак мае, па чарзе трасца людзей перабірае й кожнаму чалавеку зь іншага капыла свой нораў паказвае. Кране двух-трох, а то й якіх пятнаццаць, пазьней яшчэ колькіх, і ў камяным мяшку, як у тым караніку: усе ўзалабкі з трасцаю бяруцца... Бараніцца ж неяк трэба, бо ніхто ж таго ня ведае, калі й за каго яна другім наваратам, унадзіўшыся, учэпіцца. А калі ўжо каго трасца ўзьлюбіць, дык не адкасьнешся, каб і хацеў. Заказырышся — з рэбрамі казыры твае выламіць, паддасіся — на заверацень цябе скруціць, пабратаешся — наклёпу на самога сябе наклічаш. Адным словам, рада б душа ў рай папасьці, ды грахі не пушчаюць...

Не на вей-жа-вецер пушчана такое, што калі ў пекле не папячэшся, дык і ў тым раі ніколі табе месца ня будзе. От і пякуцца людзі, і курчацца, як шкурат на вагні, свае ды чужыя грахі адмольваючы, каб ня то што ля парогу раю, а ля свае падваротні на скапытаваным двары прыперціся...

Цяперака, гледзячы на ўсё жытае й перажытае з далёкага водшыбу, і серабранскі разьнік Лаўрэн Пячонка ў маіх вачох не такім ужо дурным здаецца. Ён, бывала, дудукаючы з пудлівым Ярыкам Хітрыцкім, што «з панскага хамута ў савецкі рай ашалеўшы ўбіўся», гаварыў гэтакае:

— Пры дурных царох нашых дзядоў-невукаў памялом ад турмы адганялі, каб мужыкі-хамуты ў рай ня ўсунуліся. Адны цыганы-канакрады й вучоныя галовы ля «парашы» таўкліся. Цяперака, як сам пане-таварыш Ярык бачыць, калі ўсе панамі й вучонымі хітрунамі парабіліся, дык і швайкі ў разьнікоў з рук тыя канакрады павырывалі, каб з раю ня выламаліся...

Толькі малады настаўнік, нябожчык Якуб Церабелец ды Цімох Баравец разумелі «разьніковыя брэдні», а «пан-таварыш» Ярык Хітрыцкі тупымі шпількамі бараніўся ад гострых Лаўрэнавых шваек:

— Бугаі забітыя праклялі пана Пячонку, калі такое ўсё пану разумнаму цёнгле вярзецца.

Жарты-жартамі, а праўда — чамярыца зь перцам: далёка даўнейшаму да нашага цяперашняга. Даўней (да слова прыйшлося) балацяная Ігуменшчына на пальцах сваіх арыштантаў лічыла, і ўсе брытыя ілбы нешта каля паўгоду Кацярынінскім трактам у Сібір пхнуліся, а цяпер і хаты нямашака без арыштанта, і дарогі да пядзі ўкараціліся: на месцы людзі ў турэмны сацыялізм паволі ўрастаюць... А ўросшы й абыўшыся, чалавек і хвалёнай часіне не дае веры, пакуль добра ня выдыхае таго, што моцна ў знакі яму далося, і душою ня вычуе неспадзеўкі прыйшлага розьніва. І калі ўжо, ачухаўшыся, падыме вочы, каб таму рэдкаму дзіву соладка ўсьміхнуцца, дык і дзіва нямашака: новая трасца ў дзьверы пачынае стукацца. Гэтак яно й сьціхата сьціхаты ніколі ў турме не здаганяе.

Шчасьця — ні на часіну, а гора — на пяцігодкі...

Тайніцы Міхала Сырадоя

У добрых людзей у нармальныя часы ноч пеўнямі мералася: да першых пеўняў узімку жанкі й дзяўчаты кудзелю пралі ці на кужаль ручайкі лёну ў сенцах пры лучыне пачэсвалі, а мужчыны лапці плялі, заваратні вілі й вязы парылі. Па другіх пеўнях усе прачыналіся, а па трэціх — жанкі шпулі на вітушкі зьвівалі, а мужчыны за кулі ці цапы на таку браліся. Па сьняданьні раніца з днём адразу сустракалася.

У турме — ня тое: пайкаю суткі біркаваліся. Дзень руханінаю к вечару падпіхаўся, а ноч сном найбольш укарачалася, каб учарашнімі наедзінамі жывот да заўтрашняга сколанага і, пэўне ж, недаважанага прыносу як-небудзь час той пераскрыгаў. Калі ж сну й не было на сяго-таго, дык вочы ўсёроўна заплюшчанымі ўсю ноч трымаліся, каб уставаць не было ніякае патрэбы. Гэтак, маўляў, і ў двух зайцоў адразу цэлілася, і сіла ашчаджалася: нешта сьнілася, нешта, калі ня думалася, дык хоць вярзлося, і пад лыжачкай меней смактала. І жывату, і галаве выгады былі немаленькія...

Такую навуку няблага ведаў і Міхал Сырадой зь Вільшчыны, чалавек, што, як сам ён, бывала, прызнаваўся, і вока ніколі нікому не запарушыў, а ўсё ў тое росьціва садавіны ўдаваўся й сьвету Божага ніколі ня бачыў. Ён і ўдзень найбольш сном намагаў, калі ніхто не дакучаў, — сам ня меў прычапкі ні да кога. Аднак гэтым разам нешта нейкае сталася з чалавекам. Урокі ня ўрокі, а сну не было на яго. Шацкі Гарбун, рыбалоў зь дзясятага калена, даўно знаўся з Сырадоем і казаў, жартуючы (гэты каб і трыццаць гадоў праседзеў, дык, мусіць, ня выжартаваўся б):

— Ты, Міхал, пра мічурынскія бэры ці пра тую, што сваімі «бутылачкамі» горла дзярэ, думаеш? Упадобаў, каб яе качка стаптала...

Міхалу ж, калі той у настроі, пальца ў рот не кладзі — бяз ногця выхапіш. І каб гэта быў не Гарбун, а нейкі ат сабе арыштанюга, дык і цяперака ў даўгу не астаўся. Аднак рыбалову выціснуў такое, што таму не дайшло й да цяму:

— Капянуў дзічку, а яна табе сьвет на ногі паставіла.

— От жа й кажу: калі бэры прыядуцца, і дзічку не да носу, — каб ладу трымацца, на паважнейшае Гарбун здабыўся. А зірнуўшы на мокрыя Сырадоевыя вочы, рыбінай мудрасьцяй наважыў жаль Міхалаў разьвесьці: — Не журыся... Калі б дурнейшымі былі ўсе краснапёркі, то й сам панам быў бы. А то прыйдзе табе, зьліжа гарошыну, і паплавок не скіўнецца. Раззлаваўся гэта я на тых краснапёрак дый боўтнуў трутам на прынаджаным месцы, каб краснапёркі мае й хвастом не вільнулі. І не журуся: ні мне, ні ім — павыздыхалі...

Да Міхалавых вушэй нешта-такі з тых краснапёрак даплывала спачатку, а празь нейкія дзьве-тры часіны й ягоныя думкі хвастамі не віхлялі... Адно нейкая чарнакосая прыгажуня лашчылася ды жоўтымі сьпелымі бэрамі частавала. Сырадой гладзіў даўгія дзявочыя косы, цалаваў духмяныя губы і кляўся:

— Не дарую, Алеська... Не дарую... Богу душу аддам, а не дарую зладзюгу...

Прыгажуня Алеська адступілася й вочы на апалую, разьбітую бэру апусьціла, гаворачы старому Сырадою:

— Сорамна... Надта сорамна... Сам ён сябе пакарае...

Кулём кінуўся Міхал да прыгажуні, каб сорам уняць, каб сорам сэрца Алесінага не катаваў... І рукі разьвёў Міхал: Алесі як не было. Толькі на сухіх галінках разьдзёртае ветрам дзічкі дагнівалі, нанізаныя нейчымі рукамі, чатыры Сырадоевыя бэры... І Сырадой моцна крыкнуў, але так як бы гэта цэлая Вільшчына бэрамі ягонымі калаціць зышлася:

— Гэта ж разбой!.. Гэта ж нявіданае няшчасьце!..

* * *

Калі пад столяй пачарнела, перапаліўшыся, «лямпачка Ільліча» ды патушыліся ліхтары ля дубальтовых зялезных брамаў на турэмным дворышчы, у камяніцу зірнула знадворку сьветла-сіняе халоднае неба. Жаўтаватыя перад гэтым у сьвятле ліхтароў дзьве таполі край аднае страхі й касяк турэмнага муру ўвачавідкі пабялелі й зайскрыліся. Хрусткія йскрынкі — сьняжынкі-зорачкі, быццам тыя сьветлячкі-пырхаўкі ўначы або буйныя купальскія росы ў бляску вогнішча на лістох папараці, займаліся, патухалі й зьліваліся ў суцэльнае, мілае воку беліва.

Пад нейчымі нагамі скрыпеў крохкі маразяны сьнег. Дзесьці саўсім блізка сьпявалі, зьлятаючы зь седалаў, апошнія гультаяватыя певуны. Лопаліся, данятыя марозам, хварбаваныя начарна дошкі вартавых вежаў-будак.

Гэтак над растоптанай глухімі мурамі чалавечай радасьцяй неахвотна кланялася хрусткай марозьлівай раніцы й разьміналася зь ёю пераможаная сонцам ноч, каб у новы дзень каранямі мацней урасьціся...

Можа б, і адкруціўся чорны калаўрот начніцы-вядзьмаркі, каб на яго шырокі понаж ды нага чалавека-праўдалюба ступіла?

Але як бы яно там ні было, а раніца — раніцай. Гэта ж пачатак дня. Няхай сабе новы дзень і не прынясе добрых навінаў, і не ўскалыхне затхлага сьмердзіва камяное завоіны нумар тры, але ўжо адно тое, што ён, хоць і найгоршы ад усіх тых, што, турэмныя норавы спрытна людзьмі ўтаймаваўшы, вечарам уступілі ды зь сьлепавокімі змрокамі, абдымаючыся, заручаліся, — не ўчарашні, а сёньняшні, новы й ніводнай жывой душы ня ведамы, і як бы яно там ні сталася, а сім-тым дый выразьніцца, рабіла сваё.

На кавалачку нетрывалага спакою расхінала раніца маленькія чалавечыя надзеі: ану ж дый на нашай гразкай вуліцы маладзіковы кірмаш будзе!..

Міхал Сырадой маўчаў. Меў ён вялікія думкі і ўсё да нечага прыслухоўваўся...